Пролетарыі сіхкраеў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajow, łaczcie ęs
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

# САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І КАЗАЦКІХ ДЭПУТАТАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ПЯТНІЦА
17 ліпеня 1931 г.
№ 162 (3251)

1-я Образцовая типография Москва, Моховая
Библиотека

М. Гнілякевіч

## За разгортваньне работы сэкцый пры сельсаветах

Пастановы X Усебеларускага і VI Усесаюзнага зьездаў саветаў ёсьць фактычна праграма разгорнутага сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце. Задачамі саветаў і райвыканкомаў зьяўляюцца пасьпяховае выкананьне гэтай праграмы і пасьпяховая перамога тых цяжкасьцяй, якія стаяць на гэтым шляху.

Асабліва адказныя задачы зараз стаяць перад сельсаветамі, якія сапраўды павінны стаць на чале калгаснага руху і забясьпечыць суцэльную калектывізацыю бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і ліквідацыю на гэтай базе кулацтва як клясы. Гэтую задачу сельсаветы змогуць выканаць толькі пры залучэньні шырокіх працоўных мас у работу сельсаветаў, пры ўцягненьні ў работу ўсіх членаў сельсаветаў.

Калі некаторыя формы масавай работы ў вёсцы скарыстоўваюцца большменш здавальняюча, як, напрыклад, пленумы сельсаветаў, групы беднаты, розныя нарады, агульныя сходы і г. д., то гэтага зусім нельга сказаць адносна сэкцый пры сельсаветах, у той час, як сэкцыі зьяўляюцца адной з важнейшых форм работы сельсаветаў.

Сучаснае становішча работы сэкцый зьяўляецца зусім нездавальняючым. Аб гэтым гавораць розныя матар'ялы з месц, сводкі райвыканкомаў аб масавай рабоце, пастановы РВК па дакладах сельсаветаў, акты абсьледаваньня раёнаў і сельсаветаў інструктарскім апаратам ЦВК і іншыя матар'ялы. Аб гэтым таксама сьведчыць і нездавальняючае выкананьне ў паасобных раёнах розных нарыхтовак, і гаспадарча-палітычных кампаній і г. д.

Прычынамі дрэннай работы сэкцый пры сельсаветах зьяўляецца тое, што на іх работу яшчэ не зварочваецца належнай увагі ні сельсаветамі, ні райвыканкомамі. На мясцох да гэтага часу не разумеюць той агромністай ролі сэкцый, якую яны павінны адыграць у сацыялістычным будаўніцтве, ва ўцягненьні ў сацыялістычнае будаўніцтва шырокіх працоўных мас; на мясцох да гэтага часу няма належных арганізатараў масавай работы; сэкцыі, калі яны і працуюць, дык працуюць цяжкамі, іх работа ня носіць сыстематычнага і тым больш плянавага характару.

Былі яшчэ і такія тлумачэньні адсутнасьці належнай работы сэкцый: сэкцыі ня маюць належнага пра іх палажэньня і, такім чынам, сэкцыі дакладна ня ведаюць зьместу сваёй работы. Аднак, з вывучэньня матар'ялу з месц відаць, што ў шмат-якіх сельсаветах да гэтага часу нават не арганізаваны яшчэ сельска-гаспадарчыя вытворчыя нарады. Сельска-гаспадарчыя вытворчыя нарады зьяўляюцца вельмі важнай сэкцыяй, пра якую ёсьць зацьверджанае, апублікаванае і шырока распаўсюджанае палажэньне, выданае 21-III 1930 г. Адсюль відаць, што дрэнная работа сэкцый заключаецца ня толькі ў тым, што пра іх да гэтага часу ня было адпаведнага палажэньня а, галоўным чынам, таму, што да гэтага часу яшчэ няма дастатковага кіраўніцтва сэкцыямі з боку райвыканкомаў, а таксама і з боку сельсаветаў.

Калі азнаёміцца з пастановамі, якія прымаюць РВК па дакладах сельсаветаў аб іх дзейнасьці дык відаць, што РВК ці зусім нічога не гавораць аб рабоце сэкцый, ці даюць агульныя дырэктывы—«кажывіць» работу сэкцый, прапанаваць «арганізаваць» сэкцыі там, дзе іх няма, «пераключыцца» ў рабоце сэкцый на выкананьне чарговых задач, што стаяць перад сельсаветамі і г. д.

Тут трэба яшчэ адзначыць адзін дробны факт, які ў той-жа час зьяўляецца вельмі яскравым прыкладам таго, як райвыканкомы і сельсаветы вывучаюць заканадаўства пра сэкцыі. Ужо больш году як існаваўшыя пры сельсаветах камісіі называюцца сэкцыямі. Аб гэтым запісана і ў палажэньні пра сельсаветы, але РВК і сельсаветы ўсё яшчэ працягваюць называць іх па старому—камісіямі. Гэта гаворыць аб тым, што адпаведныя пастановы пра сэкцыі не вывучаюцца, не прапрацоўваюцца.

Быхаўскі РВК 13 чэрвеня 1931 году, заслухаўшы справаздачу Асавецкага с-савету аб яго дзейнасьці, адзначыў, што «камісіі пры с-саветах неарганізаваны і неаформлены, адсутнічае работа сярод беднаты і жанчын, актыў вакол работы савету не згуртаваны і грамадзкасьць у працу саветаў не прыцягнута». Даўны шэраг практычных прапаноў аб разгортваньні работы па выкананьні розных гаспадарчых заданьняў, Быхаўскі РВК адносна сэкцый запісаў толькі наступнае: «катэгарычна прапанаваць сельсавету ў дэкады тэрмін арганізаваць і аформіць намісіі пры сельсавеце, уцягнуўшы у іх работу вастаўніцтва, калгаснікаў, бедняковаў, жанчын, партызан і актыў вёскі, дапамагаючы ім у складаньні плану працы, наладзіўшы іх дзейнасьць». Адзначыўшы дрэнную работу сельсавету, РВК ня здолеў выкрыць карэньні дрэннай работы і не зьвязаў гэта з адсутнасьцю масавай работы.

Буда-Кашалеўскі РВК 13 чэрвеня г. г. па справаздачы Дуравецкага с-савету аб яго дзейнасьці адзначыў, што «работа сэкцый пры с-савеце адсутнічае» і таму прапанаваў сельсавету наладзіць плянавасьць у рабоце сельсавету, адначасова ажывіўшы працу сэкцый пры сельсавеце, уцягнуўшы ў работу бядняцка-калгасныя масы.

Клімавіцкі РВК, заслухаўшы 3-га ліпеня г. г. даклад Дубровецкага с-савету аб яго дзейнасьці, прапанаваў сельсавету «паставіць арганізацыйна-масавую работу з беднатой, з актывам і калгаснікамі на мабілізацыю ўвагі апошніх на поўную ліквідацыю маючыхся прарываў», таксама не ўвязаўшы буйных недахопаў у рабоце сельсавету з поўным адсутнічаньнем масавай работы.

У апошні час нават у некаторых адказных работнікаў зьявіліся думкі аб тым, што сэкцый пры сельсаветах павінны быць зьліквідаваны, бо яны сябе за апошнія 5 год зусім не апраўдалі. Замест таго, каб вывучыць прычыны дрэннай работы сэкцый, і зьнічыць недахопы, арганізаваць работу сэкцый, забясьпечыць ім практычную дапамогу ў штодзённай рабоце і замацаваць дасягнутыя посьпехі,—яны становяцца на больш лёгкі шлях ліквідацыі сэкцый ці скарачэньня іх.

Тут цікава адзначыць, як у апошні час падыходзяць да гэтага пытаньня ў УССР. Там ня чутно гутарак аб тым, што сэкцыі сабе не апраўдалі, замест гэтага там шукаюць новых шляхоў у рабоце сэкцый пры сельсаветах. У некаторых мясцох УССР сэкцыі разьбіваюцца на брыгады, якія вядуць работу па больш вузкіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

І ў БССР ёсьць шмат прыкладаў, калі добра пастаўленая масавая работа саветаў, добра наладжаная работа сэкцый, дала значныя вынікі ў практычнай рабоце саветаў. Тыя сельсаветы, дзе сэкцыі арганізаваны і добра працуюць, стаяць наперадзе па выкананьні розных гаспадарчых і палітычных заданьняў і па правядзеньні розных кампаній. Але, наогул, трэба сказаць, што райвыканкомы мала што зрабілі для ўзмацненьня сэкцый і для разгортваньня іх работы.

Калі трэба правесьці якую-небудзь чарговую кампанію, ці выканаць тое ці іншае заданьне, на мясцох, забыўшыся пра сэкцыі пры сельсаветах, становяцца на шлях арганізацыі розных штабаў, паходаў, камісій і г. д., зусім не скарыстоўваючы сэкцыі, як важнейшую форму масавай работы ў саветах. Сэкцыі пры сельсаветах толькі тады разгорнуць, як сьлед, сваю работу, калі і саветы і РВК зразумеюць, што пасьпяховасьць выкананьня ўсіх заданьняў, усіх кампаній шчыльна зьвязана з работай сэкцый.

Зараз сельсаветы, як ніколі загружаны работай, ім патрэбна ўсялякая дапамога. Пры такім становішчы бязьдзейнасьць сэкцый нельга нічым апраўдаць. Трэба зразумець, што старшыня сельсавету павінен быць у першую чаргу добрым арганізатарам. Зусім непатрэбна, каб усю работу сельсавету старшыня браў на сябе; замест гэтага ён павінен нагрузіць і прымусіць чотка працаваць часткі сельсавету, якімі па сутнасьці зьяўляюцца сэкцыі савету.

У 1925 годзе было выдана палажэньне пра камісіі пры сельсаветах (сэкцыі называліся тады яшчэ камісіямі). З таго часу зьмянілася назва сэкцый, колькасьць сэкцый і зьмест іх работы. З тае прычыны, што работа сэкцый ня ўсюды запаўняецца адноль-кавым зьместам, што яны набываюць стракатасьць у розных раёнах, што сэкцыі, дзе яны працуюць, не ахопліваюць усёй работы ў адпаведных галінах,—выданьне палажэньня пра сэкцыі зараз зрабілася вельмі неабходным і насьпеўшым.

Улічваючы гэта прэзыдыум ЦВК БССР 28-га чэрвеня г. г., у скасаваньне пастановы за 1925 год, выдаў новае палажэньне пра сэкцыі пры сельсаветах; згодна гэтага палажэньня пры сельсаветах арганізуюцца сэкцыі па справах: 1) сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі; 2) культасьветная; 3) сэцыяльная і добрабыту; 4) фінансава-бюджэтная; 5) па паляпшэньні працы і быту жанчын; 6) РСІ.

Гэтыя сэкцыі зьяўляюцца асноўнымі, якія павінны быць абавязкова ўтвораны пры ўсіх сельскіх (месцачковых) саветах, пры чым сэкцыя сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі будуецца па тыпу вытворчых нарад, сэкцыі па культурна-асьветных справах дзейнічаюць, як саветы культурнага будаўніцтва. Пры тых сельсаветах на тэрыторыі якіх ёсьць значная колькасьць рабочых і батракоў, ці дзе значна разгорнуты адходныя промыслы, арганізуецца сэкцыя працы.

Палажэньне пра сэкцыі патрабуе самага шырокага ўцягненьня грамадзкасьці ў работу сэкцый. Для работы ў сэкцыях прыцягваюцца рабочыя, батракі, калгаснікі, бедняки, сераднякі, жанчыны, дэлегаты, прадстаўнікі прафесыйных і грамадзкіх арганізацый, дэмабілізаваныя чырвонаармейцы, члены ЛКСМ, ўрачы, настаўнікі, аграномы і г. д., пічым склад сэкцый павінен быць забясьпечаны прадстаўнікамі ўсіх нацыянальнасьцяй.

Дзейнасьць сэкцый пры сельсаветах павінна быць накіравана ў першую чаргу на ажыцьцяўленьне задач рэканструкцыі сельскай гаспадаркі шляхам калектывізацыі,—гэта зьяўляецца асноўным пытаньнем на вёсцы. Практычна сэкцыі павінны накіраваць сваю ўвагу на арганізацыю працы ў калгасах, пераход на зьдзельнічыну, арганізацыю бытавых устаноў, на разгортваньне культурнага будаўніцтва, на падняцьце палітычнага і культурнага ўзроўню працоўных і г. д.

На РВК і сельсаветы ўскладаецца абавязак шырока папулярызаваць зацьвежанае палажэньне пра сэкцыі сярод працоўных мас вёскі, уважліва вывучыць гэтае палажэньне і ў адпаведнасьці з ім перабудаваць сваю работу.

Райвыканкомам і сельсаветам замест агульных паказаньняў «пераключыцца», «наладзіць», «ажывіць работу», трэба аказваць канкрэтную дапамогу ў разгортваньні работы сэкцый, паставіўшы работу сэкцый на належную вышыню і зрабіўшы іх сапраўды масавым органам савету. Праз сэкцыі павінны быць уцягнуты ў практычную штодзённую работу саветаў працоўныя масы адпаведных саветаў і ўсе члены саветаў. Гэтым ў той-жа час будуць ажыцьцяўляцца і наступныя словы т. Леніна **«Вучыцеся дэмакратыі на практыцы адразу, самі зьнізу ўздымайце масы да сапраўднага, непасрэднага ўсеагульнага ўдзелу ў кіраўніцтве—у гэтым і толькі ў гэтым парука поўнай перамогі рэвалюцыі, яе цьвёрдага, прадуманага і плянамернага руху наперад».**

# БАРАЦЬБА ЗА СУСЬВЕТНЫ КАСТРЫЧНІК--БАЯВАЯ ЗАДАЧА ПАДПОЛЬНАГА РЭВАЛЮЦЫЙНАГА ДРУКУ

## Цэнтральнаму камітэту камуністычнай партыі Заходняй Беларусі

Праз межы сьвету вам—аднаму з баявых атрадаў Камінтэрну, арганізатару і правадыру гэраічнай барацьбы за дыктатуру пралетарыяту, мы—ўдарнікі друку,—пасланцы перадавых калён мільённай арміі ўдарнікаў сацыялістычнай будоўлі шлём бальшавіцкае рабсельскораўскае прывітаньне.

Адзінаццаць год таму назад магутным націскам слаўнай Чырвонай арміі, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі Савецкая Беларусь—раўнапраўная, неадлучная частка СССР—вызвалілася ад белапольскіх акупантаў. Даўно ўжо залечаны раны, што нанесьлі драпежніцкія банды фашысцкай Польшчы.

У вялікім Саюзе краіны Саветаў БССР з забітай калёніі царскіх апрычнікаў былой Расіі нячуванымі ў гісторыі тэмпамі ператвараецца ў рэспубліку волатаў—заводаў, фабрык і буйнейшых электрастанцый.

Дзесяткі тысяч сялян беднякоў і сераднякоў упэўніліся ў бясспрэчнай перавазе калектыўнай гаспадаркі над аднаасобнай, беспаваротна канчаюць з дзедаўскай гаспадарнай і штодзённа аб'яднаюцца ў калгасы. Машына-трактарныя станцыі, саўгасы, калгасы пераможна, назаўсёды сьціраюць межы сталыпінскіх хутароў.

БССР упэўнена ідзе па шляху ажыцьцяўленьня суцэльнай калектывізацыі ліквідацыі кулацтва як клясы—апошняй апоры капіталізму. Ніякімі спробамі клясавы вораг ня стрымае нашага пераможнага руху да сацыялізму.

Правільнае вырашэньне ленінскай нацыянальнай палітыкі, цьвёрдае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі бесьперапынна ўзрэстае творчы энтузіязм, вялізарнейшую актыўнасьць шырокіх мас працоўных. Праца стала справай гэройства і адвагі.

Мы ведаем, што Савецкая Беларусь зьяўляецца аванпостам СССР—сацыялістычнай бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету, таму мы пільна сочым за межамі, штодзённа ўзмацняем абарону заваеваньняў Кастрычніцкай рэвалюцыі і пад баявымі сьцягамі партыі Леніна напружваем усе сілы на пасьпяховае выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, на завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

А калі капіталісты ўсіх колераў і масьцей са сваімі сацыял-фашысцкімі прыхвасьнямі, цяпер шалёным разгулам дзікага тэрору шукаючы выхаду з крызісу, папрабуюць напасьці на Савецкі Саюз, мы станем у першыя рады барацьбітоў адзінага фронту працоўных усяго сьвету супроць капіталу—нашага адзінага ворага. Пад сьцягам брацкіх кампартый нашы браты па клясе ўсіх краін выступяць у апошнюю схватку працы з капіталам за перамогу сацыялізму ва ўсім сьвеце.

Няхай жыве Камуністычны Інтэрнацыянал—баявы штаб міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі!

## Рэдакцыі „Ды Ротэ Фанэ"

### і яе рабоча-сялянскім карэспандэнтам ад імя рабселькораў БССР палкае бальшавіцкае прывітаньне

Дарагія таварышы!

З вялікай радасьцю мы атрымалі ваша прывітаньне. З вялікім энтузіязмам сустрэў увесь 2-гі Ўсебеларускі зьезд рабсельвваенкораў вашы баявыя пажаданьні нашай пасьпяховай рабоце.

Мы маем на сёньняшні дзень вялікі ўздым рабселькораўскай работы і вялізарны рост нашага камуністычнага пралетарскага друку. Мы выпускаем зараз па Беларусі 13 цэнтральных, 45 раённых і 50 заводзкіх друкаваных газэт у агульным гадавым тыражы на 1931 год звыш 100.000.000 экз., на 5.000.000 насельніцтва БССР. Акрамя таго ў кожным з астатніх раёнаў мы выпускаем шклаграфічную шматтыражку. У большасьці прадпрыемстваў выходзяць насьценныя газэты на кожным цэху. Мы пераходзім на штодзённыя пэхоўкі. У кожным саўгасе, у большасьці калгасаў мы выпускаем насьценныя газэты. Мы прыступілі да выпуску штодзённых палявых газэт на час другой бальшавіцкай ўборачнай кампаніі.

Пралетарыі Савецкага Саюзу—«ўдарная брыгада сусьветнага пралетарыяту». Гэта накладае на нас адказьнейшы абавязак яшчэ больш рашуча і ня ўхільна змагацца за кожны процант нашых плянаў—за новыя фабрыкі мэталю—гіганты індустрыі, за новыя фабрыкі зямлі—тысячагектарныя саўгасы, за калгасы, ЗА РЭКАНСТРУКЦЫЮ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

І ў гэтай вялізарнай напружанай рабоце ўсяго пралетарыяту, усіх працоўных Савецкага Саюзу выдатнае месца займае друк і яго рабоча-сялянскія і вайсковыя карэспандэнты пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі.

Увесь наш друк, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, праводзіць вялізарную штодзённую арганізацыйную, апэрацыйна-масавую работу на выхаваньні рабочых мас, па іх мабілізацыі на вырашэньне асноўных гаспадарча-палітычных задач, пастаўленых партыяй. Яны вядуць нястомную, бязьлітасную барацьбу супроць усіх відаў апартунізму, за адзіна правільную ленінскую генэральную лінію партыі.

У рабоце нашага друку, у баявых органах нашай камуністычнай партыі і савецкай ўлады ўдзельнічаюць да 70.000 рабочых, калгасных і сялянскіх, вайсковых, юных і дзіцячых карэспандэнтаў. Яны зьяўляюцца па азначэньні правадыра нашай партыі і ўсяго Камінтэрну тав. Сталіна «камандзірамі пралетарскае грамадзкае думкі». Яны сваім практычным удзелам у рабоце газэт, праз гэтыя газэты штодзённа і штогадзінна арганізуюць і мабілізуюць вялізарнейшую волю і энэргію, невычарпальную творчую ініцыятыву рабочай масы, калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў на барацьбу за генэральную лінію нашай камуністычнай партыі, на барацьбу за выкананьне пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва ў чатыры гады.

ДРУГІ ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД РАБСЕЛЬВАЕНКОРАЎ ГОРАЧА ВІТАЕ КАМУНІСТЫЧНУЮ ПАРТЫЮ НЯМЕЧЧЫНЫ І ЯЕ БАЯВЫ ОРГАН «ДЫ РОТЭ ФАНЭ».

Мы перадаем праз баявы орган КП(б)Б прывітаньне ўсім рабоча-сялянскім карэспандэнтам Нямеччыны. Мы абяцаем яшчэ больш разгарнуць рабселькораўскую работу, яшчэ больш пашырыць рабселькораўскі рух, перабудаваўшы яго на падставе пастановы ленінскага ЦК УсеКП(б).

Мы прызнаём, што інтэрнацыянальная сувязь была да гэтага часу слабым вучасткам нашай работы. Мы абяцаем разгарнуць і ўзмацніць надалей інтэрнацыянальна-выхаваўчую работу, заклікаем ўсіх рабселькораў вывучаць замежныя мовы ў тым ліку і міжнародную дапаможную мову—эспэранта. Будзем імкнуцца ўзмацняць праз усебеларускую газэту «Рабселькор» сталую сувязь нашых газэт з пэўнымі, вызначанымі вамі, фабрычна-заводзкімі і сялянскімі газэтамі Нямеччыны.

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ! Мы добра ведаем аб тым цікаваньні, якому падпадаюць як камуністычна-пралетарскі друк, так і рабоча-сялянскія карэспандэнты Нямеччыны з боку сацыял-фашыцкай паліцыі. Мы таксама добра ведаем, што гэта ня прыняе вашай волі і энэргіі да перамогі, што гэта ўзмацніце і пашырае рэвалюцыйны рух. Мы ўпэўнены, што шматлікія арышты рэдактароў, сыстэматычнае закрыцьцё газэт, у прыватнасьці «Ды Роте Фанэ», не паслабіць вашай рэвалюцыйнай дзейнасьці, а наадварот—яшчэ больш узмоцніць і разгорне вострую клясавую барацьбу пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, мабілізуючы пад яе штандары ўвесь пралетарыят і сялянскія масы для канчатковых пераможных баёў за дыктатуру пралетарыяту, за сацыялізм.

Няхай жыве гэраічная камуністычная партыя Нямеччыны і яе баявы незмаўкаючы орган «Ды Ротэ Фанэ»!

Няхай жывуць рабочыя карэспандэнты Нямеччыны!

Блізка-будучай Савецкай Нямеччыне Рот фронт! Рот фронт! Рот фронт!

## Курс нямецкай маркі падае з кожным днём

БЭРЛІН, 15-7. Паводле паведамленьня «Вольф Ам Абэнд» мерапрыемствы ўраду для заспакаеньня становішча пакуль не дасягнулі сваёй мэты.

Абесцаненьне нямецкіх марак загрыпчай ужо пачалося. Фунт стэрлінгаў катыруецца 22,50 маркі, г. зн. на 10 проц. вышэй нармальнага курсу, але і гэты курс зьяўляецца толькі наміналным таму, што банкі адмаўляюцца купляць вялікія сумы нямецкіх марак. Другія біржы працягваюць адмаўляца катываць нямецкую марку.

Курсы аблігацый нямецкіх банкаў працягваюць зьніжацца. У Амстэрдаме ўчора катыроўка пазыкі Юнга дасягнула свайго самага нізкага ўзроўню—54³/₈ курсу, што складае палову наміналнай каштоўнасьці акцый.

Унутраны мараторы, які ўрадам Нямеччыны яшчэ не абвешчаны, у сапраўднасьці ўжо праведзены ў жыцьцё таму, што ніхто ня ўплачвае даўгоў у чаканьні абесцаненьня маркі.

## Чарговая кампанія фашысцкага тэрору на Заходняй Беларусі

ВІЛЬНЯ, 14-7. Фашысцкі друк ня спыняе зьмяшчаць штодня паведамленьні аб масавых обысках і арыштах, якія адбываюцца ў апошнія дні амаль кожную ноч па ўсёй Заходняй Беларусі.

Так, пасьля прыдушэньня намаганьнямі паліцыі і войска ўсеагульнай забастоўкі ў Гродне, гэтымі днямі ў рабочых кварталах Гродна адбыліся масавыя вобыскі і арышты рабочых западозраных у камуністычнай дзейнасьці. Усе рабочыя, якія прымалі больш-менш актыўны ўдзел у забастоўцы, арыштаваны. Дакладная колькасьць арыштаваных невядома. Усе арыштаваныя знаходзяцца ў мясцовым вастрозе. З іншых месц ў Гродна пры было шмат паліцыі. Становішча ў горадзе вельмі напружанае. У турме адбываюцца дзікія катаваньні над паліт вязьнямі.

Беласток пасьля забастоўкі перапоўнены паліцыяй. Аблавы, вобыскі і арышты адбываюцца кожную ноч. Часовы арыштаў і турма перапоўнены. У засьценках і габінэтах «спэцаў з дыфэнзывы адбываюцца крывавыя расправы над перадавымі прадстаўнікамі рабоча-сялянскіх рэвалюцыйных мас.

Учачы з 13-га ліпеня адбыліся масавыя арышты ў Вільні і Лідзе.

Але гэта чарговая кампанія масавых аблаў і арыштаў у Заходняй Беларусі выдаецца вялізарнейшымі разьмерамі.

У лютым тэрору супроць рэвалюцыйных мас фашысцкая дыктатура шукае ратунку.—Дзікімі катаваньнямі ў засьценках перапоўненых рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі польскія фашысты імкнуцца спыніць з кожным днём узрастаючы рэвалюцыйны ўздым.

Гэта чарговая кампанія арыштаў па сваіх вялізарных разьмерах складае ўражаньне паліцэйскіх пагромаў у рабочых кварталах прамысловых цэнтраў Заходняй Беларусі.

## Польскі ўрадавы друк заклікае да спакойнасьці

ВАРШАВА, 15-7. Польскі друк пара нейшаму старанна бароніць нямірымую пазіцыю занятую Францыяй у адносіне да падзей у Нямеччыне і заклікае да спакойнасьці запэўняючы, што **нямецкая фінансавая катастрофа не пагражае Польшчы.**

Орган эндэкаў «Газэта Варшаўска» ставіць запытаньне: «дзе канчаецца сапраўдны эканамічны крызіс і дзе пачынаецца палітычная інсцэніроўка». Газэта папракае польскае міністэрства замежных спраў у бязьдзейнасьці і баіцца, што «далейшая пасыўнасьць польскай дыпляматы можа прывесьці да такіх-жа вынікаў як і ў часе Гаагскай канфэрэнцыі, калі Нямеччына атрымала назад прырэйнскую вобласьць і дабілася зьмяншэньня сумы рэпарацыйных плацяжоў без якіх небудзь гарантый для польскіх заходніх меж».

«Газэта польска» заяўляе, што «нямецкая катастрофа не зьяўляецца сусьветнай катастрофай, і што зараз, пасьля прыняцьця пляну Гувэра яна выклікана толькі самапубчай палітыкай Нямеччыны. Вялізарны бюджэт, узброеньне бясконцыя сродкі, якія ўкладаюцца ў кішэні нацыяналістычных арганізацый, аграрная палітыка тупога фанатыка—Шыльце, ударылі па Нямеччыне. Нямеччына зьяўляецца ў значнай меры прычынай эканамічных труднасьцяй, якія перажывае сьвет,—заключае газэта.

Тыя-ж думкі разьвівае і «Ілюстраваны Кур'ер Цодзенны». «Мы параней шаму перажываем крызіс, а злоты стаіць як непарушная сьцяна». Адначасова, аднак, газэта падкрэсьлівае, што ў працягу ўчарашняга дня курс даляра зноў значна павысіўся.

Увесь польскі друк бяз выключэньня апэлюе да «нэрваў» насельніцтва і заклікае да спакойнасьці, пры якой нямецкая катастрофа не закране Польшчу.

«Польшча павінна вытрымаць і вытрымае», заяўляюць газэты. Аднак адзяленьнем нямецкага банку моцна ўдарыла па буйных прадпрыемствах Гурнага Шлёнску. Газэты змушаны прызнаць гэта паміж радкоў.

«Газэта Варшаўска» спрабаваўшая даць больш падрабязныя зьвесткі аб Гурным Шлёнску канфіскавана. Афіцыйная «Газэта Польска» ўчора зазначала, што ў ліку французскіх запатрабаваньняў знаходзіцца і пункт аб «усходнім Лікарно».

«Работнік» сьцьвярджае, што паведамленьне быццам Францыя патрабуе ад Нямеччыны прызнаньня заходніх меж Польшчы, зьяўляецца газэтнай бучай.

# Раёны, сельсаветы, МТС, саўгасы і калгасы, уключайцеся ў конкурс на лепшае правядзеньне сенаўборкі і сілосной кампаніі!

## ВЫШЭЙ ТЭМПЫ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ЎБОРАЧНАЙ

Да пачатку ўборачнай кампаніі ў БССР засталіся літэральна лічаныя дні. Між тым, падрыхтоўка да ўборкі ў цэлым радзе месц усе яшчэ праходзіць яўна нездавальняюча.

Матар'ялы, якія мы друкуем сёньня, сьведчаць аб тым, што рад калгасаў недаацэньвае вялікай важнасьці поўнай і своячасовай уборкі ўраджаю для ўсяго нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Толькі гэтым можна тлумачыць тое, што ў прыгарадным саўгасе імя Будзённага, у калгасе «Юны Камунар» і ў іншых калгасах падрыхтоўку да ўборкі яшчэ не пачыналі: не адраманталі ўборачных машын, інвэнтару, не падрыхтавалі складачных памяшканьняў для ссыпаньня збожжа.

Дырэктыва партыі і ўраду аб неадкладным пераводзе ўсёй работы калгасаў на зьдзельнічыну, злачынна ігнаруецца ў значнай частцы калгасаў БССР.

Бязумоўна, што ўсё гэта зьявіцца буйнейшай перашкодай у часе правядзеньня ўборачнай кампаніі.

Той кароткі час, які застаўся, павінен быць ператвораны ў сапраўдны штурм тых прарываў, якія мы яшчэ маем у справе падрыхтоўкі да ўборкі. Трэба неадкладна выканаць дырэктыву партыі аб пераводзе ўсёй работы на зьдзельшчыну пры належнай пастаноўцы вучоты работы. Пастанова НКЗему і Калгасцэнтру СССР аб прыкладным разьмеркаваньні даходаў у калгасах на 1931 год зьяўляецца дакумантам буйнейшай палітычнай важнасьці. Гэты дакумант зьявіцца магутным фактарам уздыму прадукцыйнасьці працы, магутным вагаром у справе далейшага разгортваньня калгаснага руху.

Парт'ячэйкі, сельсаветы, праўленьні калгасаў абавязаны зараз-жа забясьпечыць шырокае абгаварэньне гэтага дакументу сярод калгаснікаў і шырокіх мас беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў.

На здымку: 80 гадовы калгаснік, пастух-ударнік калгасу імя Леніна, Аршанскага раёну.

## Пастанова Калегіі НК Земляробства БССР

### Аб арганізацыі ўсебеларускага конкурсу на правядзеньне сенаўборачнай і сілосной кампаніі

Надаючы выключнае гаспадарча-палітычнае значэньне пасьпяховаму правядзеньню сенаўборкі і сілосной кампаніі і выходзячы з таго, што посьпех залежыць выключна ад разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва шырокіх мас рабочых саўгасаў, калгаснікаў і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў, калегія НКЗему БССР пастанаўляе:

1. Арганізаваць Усебеларускі конкурс на ўдарны раён, МТС, сельсавет, саўгас, калгас, забясьпечыўшы своячасовае і поўнае выкананьне і перавыкананьне плянаў сіласаваньня і сенаўборкі з двайным укосам заліўных і штучных сенажацяй.

2. Для кіраўніцтва і правядзеньня конкурсу арганізаваць пры кармовым сэктары НКЗБ конкурснае бюро па сенаўборачнай і сілосной кампаніі ў складзе: ад кармовага сэктару НКЗБ тав. **Сакалова, Барановскага** і прадстаўнікоў ад ЦК ЛКСМБ. Саюзу жывёлагадоўчых саўгасаў, Саюзу земляпаўгасаў, Белсельтрэсту, Сьвінатрэсту, Белкаансаюзу, Белкалгасцэнтру, Белсельбуду, Інстытуту Сьвінагадоўлі, газэт «Зьвязда», «Савецкая Беларусь» і «Калгаснік Беларусі» па і чал.

3. Прапанаваць райземаддзелам увайсьці з прадстаўленьнем у райвыканкомы аб арганізацыі ў раёнах камісій па правядзеньні конкурсу па сенаўборцы і сіласаваньні кармоў.

4. Для прэміраваньня лепшых саўгасаў і калгасаў устанавіць натуральныя прэміі с.-г. машынамі, аўтамашынамі і г. д. а для прэміраваньня ўдарных брыгад і асобных брыгадзіраў устанавіць грашовыя і натуральныя прэміі.

Прасіць СНК БССР выдзеліць спэцыяльны прэміявальны фонд.

5. Прапанаваць сэктару снабжэньня НКЗБ па патрабаваньню конкурснага бюро выдзеліць неабходную колькасьць сенаўборачных машын-сячкарань і сіласарэзак для прэміраваньня саўгасаў і калгасаў за лепшае правядзеньне сенаўборачнай і сілосной кампаніі.

6. Прасіць паказаныя ў п. 2. арганізацыі ў двухдзённы тэрмін прадставіць у кармавы сэктар НКЗБ прозьвішчы вылучаных прадстаўнікоў у конкурснае бюро.

7. Кіраўніцтва па правядзеньні конкурсу ўскласьці на члена калегіі НКЗБ т. Сакалова.

8. Сэктару кадраў НКЗБ забраніраваць 5 месц у ВНУ і 20 месц у тэхнікумах для лепшых ударнікаў.

9. Конкурс скончыць да 15 кастрычніка 1931 г.

Нам. Наркамземляробства **Масюкоў.**

Менск
10 ліпеня 1931 г.

## Падрыхтоўку да ўборачнай увязаць з новым калгасным прылівам

**Магілеў.** (Наш карэспандэнт). Калгас «Чырвонаармейская камуна» па баявому падрыхтаваўся да ўборачнай. Адрамантаваны 4 конныя касілкі, 2 конныя праблёў, 5 жнеяк-самаскідак, 1 жнейка-снопавязалка, 40 калёс, увесь інвэнтар. Падрыхтаваны поўнасьцю і складачныя памяшканьні.

На час сенаўборачнай па ўсіх галінах работ уведзена зьдзельшчына. Камунары разьбіты на брыгады. Паміж брыгадамі шырока разгарнулася сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Заключаны канкрэтныя дагавары з абавязацельствамі. Сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам ахоплена амаль 100 проц. усіх камунараў.

Калгас ужо скончыў уборку, убраў звыш 100 га сена. Дзякуючы ўдарніцтву і зьдзельшчыне нормы выпрацоўкі перавыконваюцца. На 80 га заліўнога луга калгаснікі абавязаліся зрабіць два ўкосы.

Калгасам скончана і першая прапалка гародніх культур.

Калгаснікі ўзялі на сябе абавязак яшчэ вышэй узьняць хвалю сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва на пасьпяховае сканчэньне ўборачнай кампаніі, дабіцца новых посьпехаў у справе калектывізацыі. Яны абавязаліся за час уборачнай кампаніі арганізаваць у вёсцы Дубінка новы калгас і дабіцца прыліву бядняцка-сераднякіх гаспадарак у старыя калгасы. Уявіўшы добра важнасьць арганізацыі моцнай кармовай базы, камунары абавязаліся засіласаваць 29 га сіласных культур, усю батву ад гародных культур і бульбянік, і выканаць на 100 проц. плян (500 галоў) укамплектаваньня малочнай фэрмы.

— З посьпехам правялі веснавую пасеўную кампанію, даб'ёмся яшчэ больш перамог ва ўборачнай,—так заявілі камунары.

Па падпісцы на пазыку яны высунулі сустрэчны плян у 2,500 руб., замест вызначаных па пляну 2,000 р.

А. Р.

## За шырокі калгасны прыліў

**Бабруйск.** (Наш карэспанд.). Мэтад сычоўцаў, прыняты Бабруйскім раёнам, каб ліквідаваць прарывы ў калектывізацыі цалкам сябе апраўдаў. Тыя сельсаветы, якія ўдарна па-бальшавіцку ўзяліся за ажыцьцяўленьне наказаў, дадзеных ім раённым цэнтрам, маюць значныя дасягненьні ў справе калектывізацыі.

На першым месцы з усіх сельсаветаў раёну ідзе Броскі сельсавет. Атрымаўшы сацыялістычны наказ, тут быў шырока прапрацаваны на пленуме сельсавету разам з вясковым актывам і ў вёсках сярод шырокіх бядняцка-сераднякіх мас. У выніку за апошні тыдзень на тэрыторыі сельсавету арганізавалася 2 новых калгасы, вёска Брожа цалкам уступіла ў калг

# Задачы рабселькораўскага руху, парткіраўніцтва ім і ўдарніцтва ў друку

## З усёй рашучасьцю біць па апартуністычнай недаацэнцы рабселькораўскага руху

## Вышэй узьняць сьцягі ўдарніцтва ў друку

### ДАКЛАД тав. КУРЦІКА

У дакладах тав. тав. Гея і Будзінскага мы чулі аб тых вялізарных задачах, якія партыя ставіць перад усім пралетарскім друкам, перад усім рабселькораўскім рухам.

На вялізарным фронце барацьбы Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі—неадрыўнай часткі ўсяго Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік—за сацыялістычнае будаўніцтва мы бачым, як нага ў нагу магутным поступам дзясяткаў тысяч насьценгазэт і соцен тысяч рабселькораў-ударнікаў наш пралетарскі друк, як выпрабаваная зброя ў руках камуністычнай партыі, мабілізуе, арганізуе мільённыя масы рабочых, калгасьнікаў, усіх працоўных на барацьбу за практычнае ажыцьцяўленьне генеральнай лініі партыі.

Калі мы ў радзе важнейшых галін нашай сацыялістычнай прамысловасьці маем датэрміновае выкананьне пяцігадавых плянаў, дык мы маем магчымасьць сёньня, на ўсебеларускім зьезде рабселькораў паведаміць аб тым, што і наш «газэтны прамфінплян», плян газэтнай прадукцыі БССР на сёньня таксама перакрыты на 156%.

Мы таксама і ў справе рэалізацыі пралетарскага друку БССР маем выкананьне пяцігодкі за тры гады (працяжныя воплескі). Расьце і мацнее савецкая краіна, расьце і мацнее бальшавіцкі друк. Друк БССР—яскравейшы малюнак таго, як на справе ажыцьцяўляецца ленінская нацыянальная паліты ка. Газэты, якія выдаюцца на мовах усіх нацменшасьцяў БССР, даюць магчымасьць у яшчэ большай меры ўключыць шматлікія масы працоўных нацменшасьцяў у справу сацыялістычнага будаўніцтва.

Расьце і мацнее бальшавіцкі друк.

Толькі адна колькасьць дэлегатаў нашага ўсебеларускага зьезду—610 асоб—складае больш чым адну чацьвёртую частку ўсёй той агульнай колькасьці рабселькораў, якіх налічвалася ў Беларусі ў 1924 годзе. Калі ў 1924 годзе мы мелі ў БССР 2 тысячы рабселькораў, дык зараз па самых мізэрных падліках, мы маем па Беларусі звыш 40.000 рабочых, сялянскіх і вайсковых карэспандэнтаў—адданых памоцнікаў камуністычнай партыі, барацьбітоў за яе генэральную лінію (воплескі).

Раней, чым перайсьці непасрэдна да асноўных пытаньняў рабселькораўскага руху, дазвольце яшчэ і яшчэ раз падкрэсьліць тую вялізарную ролю, якую адыграў у справе стварэньня рабселькораўскага руху Ўладзімер Ільліч Леніін.

Упяршыню, дзесяткі год назад, слова «рабкор» прагучэла з вуснаў і артыкулаў тав. Леніна.

**Рабселькораўскі рух—дзецішча арганізатара і правадыра нашай партыі—дзецішча тав. Леніна.** І надзвычай характарна, надзвычай сымбалічна, што першы расійскі рабкор Бабушкін быў адным з лепшых вучняў тав. Леніна.

Такім чынам, справа стварэньня **рабселькораўскага руху, справа яго далейшага разгортваньня—гэта справа Леніна, справа камуністычнай партыі, гэта кроўная, неадлучная, непарушная частка ўсёй яе работы.**

Гарачыня, валявая напружанасьць дзён ваеннага камунізму, дзён абвостранай грамадзянскай вайны выклікала да жыцьця газэты, лістоўкі, якія разьвешваліся на плотах і друкаваліся на рознакаляровай, пярэстай паперы, **пачынаючы ад папіроснай і канчаючы кардоннай.**

Рэканструкцыйны перыяд, разгорнутага па ўсім фронце сацыялістычнага наступленьня, выклікаў да жыцьця, акрамя дзесяткаў тысяч насьценных газэт, тысячы друкаваных фабрычна-заводзкіх, саўгасных і калгасных шматтыражак і соцен раённых друкаваных газэт.

Тав. Сталін у дакладзе ЦК—XVI зьезду УсеКП(б) сказаў аб руху кароткa, але надзвычайна выразна:

**«Партыя пераўзброіла друк»** і ў справе пераўзбраеньня друку вялізарную ролю павінна было адыграць, **адыграла і адыгрывае гэта пераўзбраеньне, перабудова ўсяго рабселькораўскага руху».**

**«... Умовай далейшага ўзмацненьня рабселькораўскага руху і яго посьпехаў зьяўляецца перабудова рабселькораўскага руху» (з пастановы ЦК УсеКП(б)).**

Між тым, у нас, у БССР, пры вялізарным уздыме актыўнасьці рабселькораўскай масы, мы да апошняга часу мелі нездавальняючае кіраўніцтва рабселькораўскім рухам. У выніку таго, што ў пэўнай частцы раёнаў БССР партыйныя арганізацыі да апошняга часу не ўзначалілі таго ўздыму, які ёсьць у рабселькораўскім руху, БССР у справе масавага разгортваньня ўдарніцтва ў друку і барацьбы за ператварэньне ўдарных брыгад друку ў вядучае зьявяо рабселькораўскага руху—значна спазьнілася.

Апошнія 4-5 месяцаў зьявіліся для БССР месяцамі настойлівай, паглыбленай і разам з тым масавай работай на перабудове пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б рабселькораўскага руху. Гэтыя 4-5 месяцаў былі месяцамі не парадной шуміхі, а месяцамі клапатлівай чорнай работы па ахопе і ўзмацненьні ўзрастаючай актыўнасьці мас рабселькораў. Адным з надзвычайна важных і характарных момантаў зьяўляецца тое, што гэта работа была праведзена і праводзіцца пад кіраўніцтвам і самым непасрэдным і актыўным удзеле партыйных арганізацый з уцягненьнем шырокіх мас спэцыялістаў, гаспадарнікаў і профарботнікаў. Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і мясцовых партыйных арганізацый, пры самым непасрэдным кіруючым удзеле рэдакцый цэнтральных і раённых газэт па БССР за апошнія месяцы быў праведзены масавы агляд-самаправерка незавога друку, становішча рабселькораўскага руху і партыйнага кіраўніцтва ім, была праведзена кампанія перавыбараў рэдкалегій нізавых газэт і своячасова ўзначалена ўзьнятая зьнізу магутная глыбокая хваля канкрэтных самаабавязацельстваў-водгукаў на вядомы ўсім нам ліст менскіх ударнікаў друку. Уся гэта масавая вялізарная работа была памножана на глыбока дзелавую, практычную, насычаную палітычным зьместам падрыхтоўку да другога ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

Асноўнае, што характарызуе рабселькораўскі рух на сучасным этапе сацыялістычнага будаўніцтва—гэта далейшы магутны ўздым усяго рабселькораўскага руху, уздым пад кіраўніцтвам партыі ролі рабселькораў, як арганізатараў мас для справы сацыялістычнага будаўніцтва, выкананьня вытворчых плянаў і разгорнутага наступленьня на клясавых ворагаў. «... Гэтыя посьпехі дасягнуты наперакор спробы тав. Бухарына і іншых... дэзарыентаваць рабселькораў сваімі апартуністычнымі ўстаноўкамі аб прычынах клясавай барацьбы, прыродзе бюрократызму, аб тэрмінах індустрыялізацыі, калгасным і саўгасным будаўніцтва і г. д. Наперакор спробам змазаць палітычныя задачы рабселькораў і абмежаваць задачы рабселькораў голым «культурніцтвам», роляй інфарматараў, пасьпяхі адбіваецяў настроеў і г. д.—**рух рос як грамадзка-палітычная сіла»** (з пастановы усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху пры «Правде»).

Мы, таварышы, бачым як цэнтральнай фігурай рабселькораўскага руху становіцца рабкор-ударнік, таксама як на нашых прадпрыемствах цэнтральнай фігурай зрабіўся рабочы-ўдарнік.

Слова ударнік—гэта наша вогністае слова. І тое, што рабкор-ударнік і арганізатар ударнікаў робіцца цэнтральнай фігурай рабселькораўскага руху, а селькор-калгасьнік, ударнік-арганізатар калгаснага руху становіцца цэнтральнай фігурай селькораўскага руху — усё гэта разам узятае, памножанае на арганізуючую сілу асабістага прыкладу рабселькораў, дае нам магчымасьць у яшчэ большай меры мабілізаваць калёсальныя ўнутраныя людзкія рэсурсы на справу барацьбы за генэральную лінію партыі.

Апошняя нарада па пытаньнях рабселькораўскага руху пры газэце «Правда» досыць выразна запісала ў сваіх пастановах аб тым, як мы разгледаем ударніцтва ў друку. Нарада падкрэсьліла, што ўдарнік, як агульнага так і нізавога друку, разглядае свой удзел у бальшавіцкім друку **«як працяг сваёй ударнай работы на вытворчасьці».**

У гэтым, таварышы, у арганічным, у ленінскім злучэньні ўдарніцтва на вытворчасьці і ўдарніцтва ў друку, у працягу ўдарніцтва на вытворчасьці—ударніцтвам у друку, і то і другое, як непадзельныя, непарушныя часткі аднаго арганічнага цэлага—ударніка, адданейшага змагара за генэральную лінію партыі, у гэтым таварышы, вялізарнейшы палітычны сэнс, вялізарнейшыя сілы рабселькораўскага руху.

Ударнікі друку—ударнікі бальшавіцкіх тэмпаў на вытворчасьці ў барацьбе за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі.

Гістарычны сэнс пастановы ЦК УсеКП(б) ад 16 красавіка 1931 г. аб перабудове рабселькораўскага руху—у надзвычай выразнай і палітычна-завостранай пастаноўцы патрабаваньняў аб канкрэтнасьці, апэрацыйнасьці, спэцыяльнасьці і дыфэрэнцыяваным падыходзе да работы з рабселькорамі.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб пабудове рабселькораўскага руху і пастановы ўсесаюзнай нарады пры «Правде»—гэта разгорнутая праграма перабудовы рабселькораўскага руху ў суадпаведнасьці з патрабаваньнямі сучаснага пэрыяду, пэрыяду разгорнутага па ўсім фронце сацыялістычнага наступленьня. Як наша непасрэдная «чарнавая» падрыхтоўка да зьезду, так і сам Усебеларускі зьезд рабселькораў, форма пабудовы яго работы—жывая, пераконваючая для нас ілюстрацыя таго, як мы павінны бачыць пастанову ЦК УсеКП(б) у дзеяньні.

«Калі ў першы пэрыяд разьвіцьця рабселькораўскага руху галоўная задача рабселькораў зводзілася да выкрыцьця «дробных недахопаў мэханізму», дык зараз «рабселькоры становяцца пад кіраўніцтвам партыі арганізатарамі мас для справы сацыялістычнага будаўніцтва», дык зараз «у вялізарнай ступені ўзрасло значэньне рабселькораўскага руху, як актыўнага правадніка генэральнай лініі партыі».

Тав. Стэцкі—загадчык культпропу ЦК УсеКП(б)—у адным з сваіх дакладаў асабліва падкрэсьлівае «рабселькор—гэта **арганізатар мас,** у гэтым яго галоўнае значэньне». Не дарма мы зараз гаворым аб сувязі рабселькораўскага руху з ударніцкім рухам, аб тым, што «кожны ўдарнік павінен быць рабселькорам» і «кожны рабселькор павінен быць ударнікам». Гэта характарызуе то новае, што ёсьць зараз у рабселькораўскім руху.

Апартуністы сустрэлі ў штыхі брыгады друку.

На адным з важнейшых пытаньняў—на пытаньні аб арганізацыйна-ідэёвым узначаленьні партыйнымі арганізацыямі і рэдакцыямі газэт бурнай актыўнасьці мас рабселькораў—трэба завастрыць асаблівa значную ўвагу.

Там, дзе гэта арганізацыйна-ідэёвае ўзначаленьне слабае, або адсутнічае, там, дзе гэта арганізацыйна-ідэёвае ўзначаленьне не замацоўваецца сыстэматычнай, паглыбленай работай,—там з яшчэ большай «палзучай» настойлівасьцю імкнецца заваяваць пазыцыі апартуніст. Апартуністычныя элемэнты ўдарніцтва ў друку, ударныя брыгады друку сустрэлі ў штыхі. Сумна вядомае выступленьне Ландау ў Маскве, які сказаў, што ўдарная брыгада, гэта накшталт вайсковага камісара пры беспартыйным журналісьце; выступленьне Хаўкіна, які раіў арганізоўваць ўдарныя брыгады друку толькі ў тым выпадку, калі на прадпрыемстве ёсьць праявы... склок і г. д.).

Адзін-два характарных, «мясцовага калёрыту» прыклады. Руднянскі сельсавет, Клімаўшчына. У справе кіраўніцтва нізавым друкам—плаўны закалых ваючы самацёк. Старшыня сельсавету Міхасёў, бачыце, за пралетарскі друк, але супроць... ударных брыгад друку. Гэты самы Міхасёў на сходзе выступіў з наступнай тэорыяй: «навошта нам трэба ствараць брыгады, калі ў нас ёсьць рэдкалегіі»?

Гэты самы наскрозь гнілы апартуніст Міхасёў—чалавек надзвычай пасьлядоўны. У адным месцы ён прапануе не ствараць ўдарных брыгад у друку, а на другім сходзе ён у парадку, відаць «папулярызацыі» пастановы ЦК УсеКП(б) выступіў з наступнай прапановай: «я прапаную абраць сталых інфарматараў, калгасьнікаў, якія паведамлялі-б аб усім у насьценнай газэце».

Вось, бачыце, яскравая пераклічка паміж былым лідарам правых т. Бухарыным, які разглядаў рабселькора, як «наглядальніка», пасыўнага інфарматара, як «канал нездавальненьня» і апартуністам Міхасёвым з аднаго з глухіх раёнаў Савецкай Беларусі.

Трэба з яшчэ большай сілай бязьлітасна біць па кожнай праявe апартуністычнай недаацэнкі таго, што нізавы друк і рабселькораўскі рух зьяўляюцца актыўнымі правадніками генэральнай лініі партыі. Ні чым іншым, як грубым скажэньнем дырэктыў партыі аб рабселькораўскім руху, як аб масавым дабраахвотным руху, трэба лічыць пастанову Лепельскага РК КП(б)Б «прапанаваць партячэйкам вылучаць па адным партыйным таварышу для высьвятленьня партыйнага жыцьця», ні чым іншым як грубейшым скажэньнем установак партыі аб рабселькораўскім руху, трэба лічыць устанаўленьне ў Межанскім раёне нейкай недарэчнай пасады пад назваю «кіраўнік рабселькораўскага руху ў раёне».

Гэткія паасобныя, часам досыць шматлікія факты скажэньня ўстановак партыі ў пытаньнях рабселькораўскага руху, зразумела, ні ў якім разе не павінны затушоўваць тэй вялізарнай работы, якую зараз наша КП(б)Б пад кіраўніцтвам свайго Цэнтральнага Камітэту, праводзіць у справе практычнага ажыцьцяўленьня пастаўленай ЦК задачы, што ўся партыйная арганізацыя ў цэлам, кожная партыйная ячэйка ў паасобку нясе непасрэдную адказнасьць за становішча рабселькораўскага руху, нізавога друку, што справа кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькорамі зьяўляецца неадлучнай, адказнай часткай агульна-партыйнай работы.

## За разгорнуты паказ дасягненьняў, вастрэй адточваць апэрацыйнасьць прапагандысцкім матар'ялам

Апошняя прамова тав. Сталіна—гэта баявы «прамфінплян» і для ўсяго нашага друку і рабселькораўскага руху. Зьмест газэт, зьмест работы з рабселькорамі павінны быць адразу-ж пераключаны на мэтаімкнёнае выкананьне задач, пастаўленых тав. Сталіным і ў пастановах апошніх пленумаў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б. Падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі, аўладань не тэхнікай, поўнае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, яшчэ больш узмоцненая барацьба на два франты—вось баявыя задачы друку і рабселькораў. Самым шырокім чынам разгорт ваючы самакрытыку, змагаючыся за яе дзейнасьць нам неабходна забясьпечыць сыстэматычны, глыбокі і разгорнуты паказ нашых сапраўды вялізарных дасягненьняў сацыялістычнага будаўніцтва, паказ ударнікаў, па якіх трэба раўнацца.

Апэрацыйныя, арганізуючыя формы і мэтады работы павінны быць востра адточаны зьмяшчэньнем адпаведных прапагандысцкіх матэрыялаў, растлумачэньнем пастаноў партыі, растлумачэньнем асаблівасьцяў тых гаспадарчых абставін, у якіх мы знаходзімся.

Перабудова рабселькораўскага руху, яго паварот тварам да канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва, канкрэтныя задачы рабселькораў рэвалюцыйная дзеławітасьць зусім зра зумела ні ў якім разе не павінны быць падменены вузкалобым, абмежаваным, беспэрспэктыўным **дзяляцтвам.**

«Нэхто так злосна ня зьдзекваўся над гэтай дзяляцкаю хваробаю, як тав. Ленін. «Вузкалобы практыцызм». «безгаловае дзяляцтва»—так акрэсьліваў гэту хваробу Ленін. Ён процістаўіў ёй звычайна жывую рэвалюцыйную справу і **неабходнасьць рэвалюцыйных пэрспэктыў ва ўсіх праявах нашай штодзённай работы»** (Сталін, — «Аб асновах ленінізму»).

## Нізавыя газэты павінны стаць калектыўным рабкорам цэнтральных і раённых газэт

Справа «адзінага фронту» цэнтральнага і нізавога друку, прычым не дэкляpацыйнага, а сапраўднага «адзінага фронту», які забясьпечыў-бы поўную бальшавіцкую мабільнасьць усёй сыстэмы нашага друку—зьяўляецца надзвычайна важным пытаньнем, на якім зьезду трэба завастрыць асаблівую ўвагу.

Высоўваньне, пастаноўка тых ці іншых пытаньняў у парадку «сустрэчнага прамфінпляну» зьнізу, з боку нізавых газэт і падхопліваньне гэтага пытаньня цэнтральным друкам і ў сваю чаргу падхопліваньне фабрычнымі і калгаснымі газэтамі тых пытаньняў, якія ставяцца цэнтральнымі газэтамі, падхопліваньне іх, выходзячы з канкрэтных умоў данай вытворчасьці, данага калгасу—усё гэта павінна ўвайсьці ў цела і кроў штодзённай работы рабселькораў і нізавога друку, павінна папоўніць жалезны арсэнал форм і мэтадаў бальшавіцкага друку новай зброяй—калектыўным рабкорам у асобе нізавых газэт.

Мы ў БССР усё яшчэ значна адстаем з практычным ажыцьцяўленьнем задачы, якая пастаўлена ЦК УсеКП(б) аб тым, каб у кожным колгасе, у кожным саўгасе, МТС і насельным пункце рэгулярна выходзіла насьценгазэта.

Далёка не ва ўсіх цэхах прадпрыемстваў Беларусі ёсьць насьценгазэты. У радзе прадпрыемстваў, дзе ёсьць цэхавыя газэты, яны выходзяць ад урачыстасьці да ўрачыстасьці, ад сьвята да сьвята.

Тэмпы барацьбы за справу сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць і адпаведных тэмпаў да ўсяго нашага нізавога друку.

## Падцягнем найбольш слабыя вучасткі калгасна-вясковага друку

Культпроп ЦК КП(б)Б пасылаў 20 брыгад у 20 раёнаў Беларусі для дапамогі ў правядзеньні масавага агляду самаправеркі нізавога друку. Апроч таго, 55 раёнаў правялі непасрэдна на месцы ўласнымі сіламі гэткі-ж масавы агляд-самаправерку.

Які-ж малюнак выявіў масавы агляд самаправеркі?

Возьмем Расонскі раён. 4 газэты вы пускаюцца штомесячна; у два месяцы адзін раз—16 газэт; у 3 месяцы раз—15 газэт; у 4 месяцы раз—1 газэта і ў 6 месяцаў раз—1 газэта. Райком КП(б)Б дае зьвесткі, што рабселькораў маецца 95, а пішучых у газэты, акрамя рабселькораў,—148 (сьмех). Ня лепш справа абстаіць і ў Круглянскім раёне. Круглянскі райком партыі паведамляе, што пытаньнямі рабселькораўскага руху там кіруе... раённы інспэктар палітасьветы. Не райком партыі, не партыйная арганізацыя, а інспэктар асьветы. Прапойскі раённы камітэт партыі за подпісам заг. культпропа тав. Клімава прыслаў нам у ЦК даведку аб тым, што рабселькораў у раёне маецца 6 чалавек, а насьценгазэт па раёне маецца 42 (сьмех)

Побач з фактамі апартуністычнай недаацэнкі неабходнасьці разгортваньня і кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькораўскім рухам, мы маем рад даных, якія сьведчаць, што там, дзе раённыя камітэты партыі сталі на чале перабудовы рабселькораўскага руху.. там стварэцца дзесяткі новых насьценгазэт, узьнімаецца існуючая там сыстэматычная работа з рабселькорамі, яна ўзьнімаецца на адпаведную палітычную вышыню. Так, напрыклад, у Чэрвеньскім раёне тры месяцы назад было 30 насьценгазэт, а зараз маецца 65. Селькоры ў адзнаку падрыхтоўкі да зьезду арганізавалі новы калгас Рабкор Мэхамед (Рэчыца) у адзнаку зьезду ўнёс рацыяналізатарскую прапанову, якая дае эфэкт у 15 тысяч р. Рабочыя Менскага заводу імя Варашылава ў падарунак зьезду сабралі 68 рацыяналізатарскіх прапаноў, калгасьнікі мястэчка Родня дадаткова падпісаліся на 350 руб. на пазыку і г. д.

## Узьняць якасьць нізавога друку

Які-ж твар мае сучасная вясковая насьценгазэта, якая выдаецца ў дні на пружанай барацьбы за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі і ліквідацыю кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі?

Вось адзін з прыкладаў **газэты — хвасьціста, газэты—абываталя** (Склінскі сельсавет. Клімаўшчына). У калгасах насьценных газэт няма. Насьценгазэта выпускаецца толькі пры сельсавеце. Партячэйка газэтаю ня кіруе. Гэта газэта зьмяшчае «эпэрацыйныя зводкі» наконт таго, хто з кім і калі за апошнія часы пасварыўся на вёсцы, якая з дзяўчат з кім хадзіць на вячорнікі.

Вось аб кастрах, аб вячорках, аб мілёнках газэта піша з захапленьнем, а аб тым, што ў гэтым-жа сельсавеце створаны калгас цалкам з кулакоў і падкулачнікаў—гэта газэта маўчыць. Сененская раённая газэта палічыла для сябе магчымым ў разгар пасеўнай кампаніі, у разгар барацьбы за калектывізацыю зьмясьціць на цэлую старонку ашпалаг: «грамадзяне, давеце вошай» (сьмех). Гэткая якасьць прадукцыі Сененскай газэты напамінае якасьць прадукцыі Менскай друкарні імя Сталіна, ў якой нядаўна кніжку па пытаньнях аб капусьце выпусьцілі ў пераплёце кніжкі аб ...сіфілісе (смех).

Там, дзе адсутнічае партыйнае кіраўніцтва, там магчымы факты накшталт пастановы селькораў Негарэльскага саўгасу, у якой дадзена наступная ацэнка саўгаснай насьценнай газэце: «За генэральную лінію наша насьценгазэта змагалася дастаткова», а далей «калгаснае жыцьцё ў насьценгазэце зусім не асьвятлялася» (сьмех).

Разам з гэтымі фактамі апалітычнасьці, мы маем там, дзе забясьпечана сыстэматычнае партыйнае кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькорамі, дзесяткі і сотні газэт, якія па-сапраўднаму на стойліва змагаюцца за генэральную лінію нашай партыі.

Вось адзін з шматлікіх прыкладаў.

У вёсцы Трапы, Высачанскага раёну, насьценная газэта выдаецца з 1928 г. Газэта выкрывае падкулачнікаў. Калі ў суседняй вёсцы сарваўся сход беднаты, дык газэта паказвае, што гэта здарылася таму, што ў гэтай вёсцы моцны ўплыў кулака, што там бедната зусім неарганізавана. У гэтым-жа нумары газэта дае станоўчы малюнак таго, як у суседняй вёсцы Хмалевічы сход беднаты прайшоў арганізавана, як было прынята заданьне аб хлебазагатоўках і пастанова аб пераходзе на калектыўную гаспадарку. Характэрны момант: газэта ў нумары, прысьвечаным міжнароднаму дню работніцы, пісала не аб «планетным» маштабе, а прыводзіла канкрэтныя факты, як Анастасьева ў апошнія гады пад уладай саветаў змагла палітычна вырасьці, як палепшылася яе матэрыяльная ўмовы. Газэта арганізуе калгасьнікаў на справу збору ляну, арганізуе калгасьнікаў на справу арганізацыі курсаў жывёлагадоўлі. Газэта газэта сваіх дасягненьняў здолела дабіцца толькі таму, што было забясьпечана сыстэматычнае чулае, уважлівае партыйнае кіраўніцтва.

## Забясьпечыць максымальную рэвалюцыйную пільнасьць

Клясавы вораг, шалёна супраціўляючыся разгорнутаму па ўсім фронце сацыялістычнаму наступленьню, робіць спробы скарыстаць рдук і рабселькораўскі рух у сваіх, клясава-варожых мэтах.

Газэта **«Калгасьнік Беларусі»** у нумары, прысьвечаным нашаму зьезду, прыводзіць між іншым лічбу, што за апошні год газэта выкрыла каля 100 кулакоў і падкулачнікаў, якія прыкрываліся назвай селькораў і нават некаторыя з іх пралезьлі ў члены рэдкалегіі насьценных газэт.

Мы ведаем, што ў Хутарскім сельсавеце Чэрвеньскага раёну ў насьценгазэту «Голас калгасьніка» пісалі дзеці збіральніка Невяроўскага, выключаныя з тэхнікуму і камсамолу. У Красьніцкай школе «замом» рэдкалегіі і фактычным дзейным кіраўніком газэты зьяўляецца жонка дзяка.

Сакратар Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б тав. Гей у сваім дакладзе прыводзіў факты аб тым, як у Галачынскім раёне у вёсцы Азарцы кулаку Калясьнікову плацілі па літру водкі за выпуск насьценгазэты.

І ў выніку робіцца зразумелым, як могуць здарыцца факты, калі, напрыклад, перадавы артыкул адной з насьценгазэт Расьнянскага сельсавету пішацца наступнай кулацкай мовай:

— «У сучасны момант надыходзіць урачыстае сьвята—сьвята канчыны нашага дарагога правадыра», а газэта «За калектывізацыю» Бабаўнянскай хаты-чытальні (Капыль) таксама падкулацкую думку сьпявае «13 год савецкая ўлада дапамагала беднаку, а толку мала».

Гэтыя асобныя факты засьмечанасьці рабселькораўскіх радоў клясава-варожымі і чужымі элемэнтамі патрабуюць ад нас узмацнёнай максымальную рэвалюцыйную пільнасьць. Бязьлітасна будзем выкідаць з рабселькораўскага руху клясава-чужыя элементы.

Неабходна таксама палепшыць склад рэдкалегій вясковых насьценных газэт, забясьпечваючы рэдкалегіі моцнымі кадрамі партыйцаў і камсамольцаў, кіруючыхся пастановай Ўсесаюзнай нарады па пытаньні рабселькораўскага руху, аб тым, што **«у сёлах рэдкалегіі павінны будавацца з селькораў, якія ўжо праверaны на барацьбе з кулакам і за калектывізацыю».** Увесь нізавы друк у цэлым, кожная насьценная газэта ў паасобку, павінны яшчэ больш узмацніць сваю бальшавіцкую ідэйнасьць, сваю бальшавіцкую баяздольнасьць, павінны ў яшчэ большай меры—кожным сваім радком выхоўваць лютую клясавую нянавісьць да ворагаў сацыялістычнага будаўніцтва.

**Барацьбу за ленінскую нацыянальную палітыку, за ўзмацненьне абароны здольнасьці, за дзейнасьць самакрытыкі—у цэнтр штодзённай увагі.**

Нам неабходна, каб у справе барацьбы за далейшае ўзмацненьне абароны здольнасьці краіны, а таксама ў справе барацьбы за ленінскую нац. палітыку з вялікадзяржаўным шавінізмам—галоўнай небясьпекай на даным этапе,—з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, з шавінізмамі ўсіх іншых колераў,—наш нізавы друк, увесь рабселькораўскі рух зьявіўся-б таксама ўдарнікам, дапаможнікам партыі.

Барацьба за дзейнасьць матар'ялаў, што зьмяшчаюцца ў друку павінна быць ўзьнята на вышыню барацьбы за дзейнасьць пралетарскай самакрытыкі.

## Задачы раённых газэт

Надзвычай адказныя задачы ў барацьбе за перабудову рабселькораўскага руху, у перабудове нізавога друку ў суадпаведнасьці з задачамі **«спэцыялізацыі»** раёнаў выпадаюць на долю раённых партыйна-савецкіх газэт:

«Баявым лёзунгам раённых газэт зьяўляецца—павярнуцца тварам да эканомікі раёнаў. Раённыя газэты павінны забясьпечыць канкрэтнае кіраўніцтва і дапамогу рабоце нізавога друку і селькораўскага руху. Адною з дзейсных форм кіраўніцтва зьяўляецца сыстэматычнае зьмяшчэньне агляду нізавога друку на старонках раённых газэт, а таксама арганізацыя зьлётаў і курсаў селькораў асобных калгасаў, саўгасаў, асобных галін сельскай гаспадаркі і г. д.» (з пастановы Усесаюзнай нарады).

## Унікнуць „галавакружэньня ад посьпехаў"

Асноўны цяжар работы нашага зьезду павінен будзе праходзіць па сэкцыях. Нам неабходна, каб кожная хвіліна работы сэкцыі была скарыстана для таго, каб на справе працягваць ажыцьцяўленьне перабудовы рабселькораўскага руху. Нам неабходна, каб пытаньне спэцыялізацыі нашага друку, у адпаведнасьці з асобнымі раёнамі, пытаньне дыфэрэнтаванага кіраўніцтва рабселькорамі—гэтыя пытаньні знайшлі ў рабоце сэкцыі самы поўны адбітак.

Мы, таварышы, за апошнія чатыры месяцы прарабілі некаторую, у агульнай суме, больш-менш значную работу ў пытаньнях рабселькораўскага руху. Але ні ў якім выпадку ў нас не павінна быць галавакружэньня ад посьпехаў. Зроблены толькі першы крок—уся работа ў далейшым, галоўнае—наперадзе. Жорсткай пасьлядоўнай праверкай выкананьня, стварэньнем новых газэт, узмацненьнем існуючых, павялічэньнем колькасьці рабселькораў, ператварэньнем ударных брыгад друку ў вядучае зьвяно друку, узмацненьнем увагі да рабселькора-адзіночкі—замацуем нашыя дасягненьні.

Дазвольце скончыць даклад лёзунгам, які быў зьмешчан у «Комсомольскай Правде» у час працэсу шкоднікаў: «на нашых вачох мы падпіваем капіталістычнаму сьвету вышэйшую меру пакаранья—«пяцігодку за чатыры гады». У гэтай справе рабселькораўскі рух пад кіраўніцтвам партыі быў, ёсьць і будзе у першых радох (воплескі).

## Супроць „абязьлічкі" ў рабоце з рабселькорамі

На фоне ўздыму рабселькораўскага руху, на фоне ператварэньня ўдарных брыгад у вядучае зьвяно рабселькораўскага руху, трэба моцна памятаць аб наступнай устаноўцы, якая дадзена ў пастанове ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху: «разьвіваць цалкам апраўдаўшы сябе вопыт «Правды» па стварэньні брыгад друку, якія зьяўляюцца прыкладам калектыўнай работы рабселькораў. Гэтыя брыгады друку ні ў якім разе не павінны, аднак, ізаліравацца ад астатняй масы рабселькораў. Яны павінны стаць вядучым зьвяном усяго рабселькораўскага руху». Ужо зараз ёсьць асобныя факты апашленьня ўдарных брыгад друку, калі адзін рэдакцыйны працаўнік падпісваецца, як ударная брыгада і г. д. і г. д.

Ударная брыгада гэта не дэкларацыя, ня прыгожы гэст, ударная брыгада друку—гэта адна з мацнейшых зброяў жалезнага арсэналу форм і мэтадаў работы пралетарскага друку. Скажэньнем таксама прынцыпу стварэньня ўдарных брыгад друку трэба лічыць спробы арганізоўваць брыгады сталым складам удзельнікаў.

Таксама да скажэньня ўдарніцтва ў друку трэба аднесьці так званыя «сусьветныя», «міжплянэтныя» маштабы, калі асобныя рабселькоры, прымаючы ўдзел ва ўдарных брыгадах друку цэнтральных газэт, лічаць для сябе «дэкваліфікацыяй» прымаць удзел ва ўдарных брыгадах унутры прадпрыемстваў, унутры калгасаў і г. д.

У частцы цэнтральных, і асабліва раённых газэт БССР ёсьць дзяляцкі, вузка-спажывецкі падыход да ўдарных брыгад, да **усёй** масы рабселькораў, як да выключна пастаўшчыкаў матэрыялаў, ёсьць «абязьлічка» ў рабоце з рабселькорамі. Адсутнасьць сыстэматычнай і паглыбленай работы з рабселькорамі, з ударнымі брыгадамі друку, адсутнасьць папярэдняга грунтоўнага інструктаваньня ўдзельнікаў рэйдаў ударных брыгад друку прыводзіць да праяў дылетанства, скальжэньня на паверхні, да аднабаковых тэндэнцый толькі выкрываць, толькі «біць» з боку паасобных брыгад друку, асобных рабселькораў. І тут мы шчыльна, твар да твару сутыкаемся з пытаньнямі практычнага ажыцьцяўленьня гэтага кіраўніцтва рабселькораўскім рухам, якое патрабуе ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове аб перабудове рабселькораўскага руху.

Замест прэсных, набіўшых сваёй трафарэтнасьцю аскоміну фармулёвак і пажаданьняў, якія д.-ні-дзе з заразу сустракаюцца, накшталт «узмацніць», «паглыбіць», «падцягнуць», замест кіраўніцтва «наогул» і ў «прыватнасьці». нам патрэбна замацаваная справамі—**конкрэтнасьць, апэрацыйнасьць, адточаная глыбокім працагандыцкім матэрыялам спэцыялізацыі, і дэфэрэнцыяваны падыход** як у рабоце рабселькораў, так і ў справе кіраўніцтва імі, як з боку партыйных арганізацый, так і рэдакцый цэнтральных, раённых і шматтыражных газэт.

## Недаацэнка рабселькора-адзіночкі—праява „левых" загібаў у рабселькораўскім руху

«Нарада падкрэсьлівае, што перабудова масавай работы друку на рэйкі ўдарніцтва, ні ў якім разе не павінна прыводзіць да ігнараваньня рабселькора-адзіночкі, да супрацьстаўленьня яму ўдарнай брыгады; ігнараваньне рабселькора-адзіночкі пры тым становішчы, калі сотні і тысячы рабкораў у індывідуальным рабкорстве знаходзяць шлях для выяўленьня сваёй грамадзкай актыўнасьці, для разгортваньня самакрытыкі для барацьбы за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва—зьяўляецца ня чым іншым, як праявай «левых» загібаў у рабселькораўскім руху. Задачы друку ў адносінах да індывідуала-рабкора ў тым, каб уцягнуць рабселькора-адзіночку ва ўдарныя брыгады друку» (з пастановы ўсесаюзнай нарады).

Наш зьезд у сваіх пастановах і ў спрэчках павінен надзвычай разгорнута, глыбока і ўдумчыва спыніцца на пытаньнях работы з рабселькорамі-адзіночкамі. Мы маем у радзе месц у радзе газэт рэальную пагрозу таго, што рабселькор-адзіночка выпадае з поля зроку нашых газэт.

Умець спалучыць работу з ударнымі брыгадамі друку разам з работай сярод рабселькораў-адзіночак у адно не адрыўнае цэлае, у работу па далейшым уздыме рабселькораўскага руху на вышэйшую ступень—у гэтым адна з нашых асноўных задач.

А ў нас, часам, нашыя асобныя насьценныя газэты можна сьмела назваць «могілкай ідэй»: новых пытаньняў узьнімаюць шмат, ініцыятыва б'е фантанам, а не навучыліся яшчэ кожную ўзьнятую справу даводзіць да канца.

Ніводнай запазычанасьці па ўзьнятых газэтамі прапановах.

Такім павінен быць наш баявы лёзунг дзейнічаньня, які забясьпечыць дзейнасьць нашай барацьбы за далейшае самае шырокае разгортваньне пралетарскай самакрытыкі, які забясьпечыць і посьпехі апэрацыйнай работы друку, бо самакрытыка, бо апэрацыйнасьць бяз жорсткай праверкі выкананьня, без барацьбы за праверку выкананьня—гэта толькі пусты гук, толькі мыльныя пузыры.

## Параднасьць, шуміха, адсутнасьць

# СЭКЦЫІ—АСНОЎНАЕ ЗЬВЯНО МАСАВАЙ РАБОТЫ СЕЛЬСАВЕТАЎ

## Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

### пра зьмену арт. 59 палажэньня пра сельскія саветы

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе арт. 59 палажэньня пра сельскія саветы (Збор З. БССР за 1930 г. № 23 паст. 154) запісаць у наступнай рэдакцыі:

«59. У мэтах залучэньня шырокіх працоўных мас у практычную работу сельскіх саветаў, а таксама для залучэньня ў штодзённую работу ўсіх членаў сельскіх саветаў, пры сельскіх саветах арганізуюцца сэкцыі па справах:

а) сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі;

б) культурна-асьветных;

в) сацыяльных і дабрабыту;

г) фінансава-бюджэтных;

д) палепшаньня працы і быту жанчын;

е) рабоча-сялянскай інспэкцыі.

Пры сельскіх саветах, на тэрыторыі якіх ёсьць значная колькасьць рабочых або батракоў, альбо дзе значна распаўсюджаны адхожыя промыслы, арганізуюцца сэкцыі працы.

Апроч гэтых сэкцый сельскі савет па меры патрэбы можа арганізоўваць і іншыя сэкцыі.

Сельска-гаспадарчыя сэкцыі будуюцца па тыпу вытворчых нарад.

Сэкцыі па культурна-асьветных справах дзейнічаюць, як саветы культурнага будаўніцтва.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гілякевіч.**

28 чэрвеня 1931 г.

г. Менск.

## Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

### пра зацьверджаньне палажэньня пра сэкцыі пры сельскіх і местачковых саветах

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Зацьверджаць палажэньне пра сэкцыі пры сельскіх і местачковых саветах.

2. Скасаваць:

а) пастанову ЦВК і СНК БССР за 23 кастрычніка 1925 г. пры камісіі, пры сельскіх саветах (Бюлетэнь СНК за 1925 г. № 6);

б) палажэньне пра камісіі рабоча-сялянскай інспэкцыі і пры раённых выканаўчых камітэтах, сельскіх і местачковых саветах (Збор З. БССР за 1929 г. № 9, паст. 49);

в) палажэньне пра сельска-гаспадарчыя вытворчыя нарады пры сельскіх саветах (Збор З. БССР за 1930 г. № 20, паст. 132).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гілякевіч.**

28 чэрвеня 1931 г.

г. Менск.

## Палажэньне пра сэкцыі пры сельскіх і местачковых саветах

### Агульныя палажэньні

1. Сэкцыі пры сельскіх (местачковых) саветах зьяўляюцца важнейшай формай уцягненьня шырокіх рабочых, батракоў, калгаснікаў, беднякоў і ўсіх працоўных у работу саветаў, формай арганізацыі творчасьці і ініцыятывы працоўных на выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва, якія пастаўлены партыяй і савецкай уладай перад сельскім (местачковым) саветамі ў момант разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце і ліквідацыі кулацтва, як класы, на базе суцэльнай калектывізацыі.

2. Дзейнасьць сэкцый пры сельскіх (местачковых) саветах павінна быць накіравана да ажыцьцяўленьня задач рэканструкцыі сельскай гаспадаркі шляхам калектывізацыі, як асноўнага пытаньня ў вёсцы.

3. Для ажыцьцяўленьня ўскладзеных на іх задач сэкцыі ўтвараюць, праз арганізуемыя імі брыгады, абсьледваньні работы дзяржаўных, гаспадарчых, каапэрацыйных і грамадзкіх устаноў і арганізацый, якія знаходзяцца на тэрыторыі савету, з мэтай выяўленьня недахопаў і палепшаньня іх работы, поўнага забясьпечаньня ў іх рабоце чоткай клясавай лініі і рашучай барацьбы з усяк імі скажэньнямі гэтай лініі ў рабоце.

Сэкцыі павінны ў сваёй рабоце трымаць сталую сувязь з прамысловымі прадпрыемствамі, машынатрактарнымі станцыямі, з саўгасамі і калгасамі, адкуль чэрпаць актыў, робячы яго сапраўдным асяродкам арганізацыі на вёсцы вакол задач партыі, рабочых, батракоў, калгаснікаў і бядняцка-сераднякцкага актыву і працоўнай інтэлігенцыі.

4. Сэкцыі папярэдня прапрацоўваюць пытаньні, якія належаць да абмеркаваньня і вырашэньня сельскіх (местачковых) саветаў, абсьледуюць паасобныя галіны работы саветаў, выконваць паасобныя заданьні пленумаў і прэзыдыумаў саветаў, уцягваюць у практычную работу саветаў усіх іх членаў і кадрыдатаў.

5. Асноўнымі сэкцыямі, якія павінны быць абавязкова ўтвораны пры сельскіх (местачковых) саветах, зьяўляюцца паводле 59 арт. Палажэньня пра сельскія саветы, сэкцыі па справах:

а) сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі;

б) культурна-асьветных;

в) сацыяльных і дабрабыту;

г) фінансава-бюджэтных;

д) палепшаньня працы і быту жанчын;

е) рабоча-сялянскай інспэкцыі.

Сэкцыі сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі будуюцца па тыпу вытворчых нарад.

Сэкцыі па культурна-асьветных справах дзейнічаюць як саветы культурнага будаўніцтва.

6. Пры сельскіх (местачковых) саветах, на тэрыторыі якіх ёсьць значная колькасьць рабочых або батракоў, альбо дзе значна распаўсюджаны адхожыя промыслы, арганізуюцца сэкцыі працы.

7. Пры арганізацыі іншых сэкцый, якія не паказаны ў арт. арт. 5 і 6 гэтага Палажэньня, сельскі (местачковы) савет, адначасна з арганізацыяй сэкцыі, вызначае яе задачы.

8. Кожны член і кожны кандыдат у члены сельскага (местачковага) савету павінен быць членам ня менш аднае сэкцыі і прымаць у яе працы актыўны ўдзел.

9. Сельскі (местачковы) савет не пазьней як праз 10 дзён пасьля перавыбараў саветаў, зацьвярджае склад сэкцый, улічваючы пры гэтым жаданьне кожнага з членаў і кандыдатаў у члены сельскага (местачковага) савету працаваць у тэй ці іншай сэкцыі, а так сама і інтарэсы паасобных сэкцый, укамплектоўваючы іх па магчымасьці асобамі з адпаведнымі ведамі і здольнасьцямі. Пры ўкамплектаваньні сэкцый членам савету саветы павінны забясьпечыць прадстаўніцтва ў кожнай сэкцыі паасобных нацменшасьцей.

10. Члены сэкцыі маюць права, з дазволу сельскага (местачковага) савету або яго прэзыдыуму, пераходзіць з аднае сэкцыі ў іншую.

11. Апроч членаў і кандыдатаў у члены сельскага (местачковага) савету—членаў сэкцыі ў ўдзелу ў рабоце сэкцый прыцягваюцца ў якасьці прымацаваных да сэкцый адпаведнымі арганізацыямі, установамі, прадпрыемствамі, саўгасамі, калгасамі: рабочыя, батракі, калгаснікі, беднякі, сераднякі жанчыны-дэлегаткі, прадстаўнікі прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый, дэмабілізаваныя чырвонаармейцы, члены ЛКСМБ, дактары, настаўнікі, аграномы і іншыя спэцыялісты і культурныя працаўнікі на вёсцы, прычым склад прымацаваных павінен забясьпечыць уцягненьне ў практычную работу саветаў прадстаўнікоў усіх нацменшасьцей.

Колькасьць прымацаваных да сэкцый павінна быць ня менш ліку членаў сэкцый.

12. Сельскі (местачковы) савет можа прымацаваных асоб, якія паказаны ў арт. 11 гэтага Палажэньня, залічаць у патрэбных выпадках у сталы склад сэкцый сапраўднымі іх членамі.

Прымаць удзел у пасяджэньнях сэкцый маюць права ўсе выбаршчыкі. Пасяджэньні сэкцый павінны адбывацца ў часы і ў мясцох, якія-б забясьпечылі масавы ўдзел працоўнага насельніцтва ў рабоце сэкцый.

14. Члены сэкцый, а таксама прымацаваныя да іх, абавязаны прысутнічаць на ўсіх пасяджэньнях сваіх сэкцый, прымаць актыўны ўдзел у прапрацоўцы абмяркоўваемых пытаньняў, прымаць удзел у розных абсьледваньнях, якія робяць сэкцыі і выконваць ускладзеныя сэкцыямі іншыя даручэньні, дакладваючы сэкцыі аб іх выкананьні.

15. Да членаў сэкцый, якія не наведваюць пасяджэньняў сэкцый альбо ня выконваюць бяз уважлівых прычын даручэньняў сэкцый, сельскі (местачковы) савет, на падставе паведамленьня сэкцыі, можа ўжываць меры грамадзкага ўзьдзейнічаньня.

16. Сэкцыя мае права ставіць пытаньне перад сельскім (местачковым) саветам аб адкліканьні з яе складу непрацуючых членаў сэкцый, а таксама мае права па гэтай-жа прычыне выключаць з ліку прымацаваных паасобных асоб, паведамляючы аб гэтым адпаведныя ўстановы, прадпрыемствы і арганізацыі і г. д. для прымацаваньня да сэкцыі замест выключаных—іншых асоб.

17. Пытаньне аб адкліканьні члена сэкцыі з апошняй вырашаецца пленумам сельскага (местачковага) савету. Пленум савету можа адначасова з гэтым паставіць перад выбаршчыкамі пытаньне аб адкліканьні члена сэкцыі таксама і са складу сельскага (местачковага) савету.

18. Сэкцыя на першым арганізацыйным пасяджэньні сэкцыі выбірае з свайго складу старшыню і сакратара сэкцыі, якія павінны быць членамі савета. Арганізацыйнае пасяджэньне сэкцыі склікаецца старшынёй сельскага (местачковага) савету або яго намесьнікам не пазьней 10 дзён пасьля арганізацыі сэкцыі.

19. Старшыня сэкцыі склікае пасяджэньне сэкцыі, падрыхтоўвае парадак дню. Сакратар сэкцыі вядзе сталы вучот членаў сэкцыі і яе актыву, вучот яўкі на пасяджэньні, вядзе пратакол пасяджэньняў сэкцыі, вучот выкананьня паасобных пастаноў і даручэньняў сэкцыі. Вучот наведваньня сэкцыі вядзецца шляхам адзнакі прозьвішча ў пратаколах пасяджэньняў сэкцыі або ў асобнай ведамасьці; у апошнім выпадку ў пратаколах паказваецца толькі агульная колькасьць прысутных.

20. На падставе зацьверджанага рэгіянным выканаўчым камітэтам гадовага пляну разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры ўсяго раёну, сэкцыі распрацоўваюць сельскія (местачковыя) пляны разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры (сельска-гаспадарчая сэкцыя—у галіне рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, культурна-асьветная—у галіне асьветы і культурнага будаўніцтва і г. д.).

21. Сэкцыя сваю работу праводзіць у плянавым парадку і ў адпаведнасьці з наказамі выбаршчыкаў і з плянам работы сельскага (местачковага) савету (у складаньні якога яна прымае непасрэдны ўдзел), сэкцыя на той-жа тэрмін складае свой плян работы.

22. Пасяджэньні сэкцыі склікаюцца ня менш аднаго разу ў месяц. На пасяджэньні сэкцыі для абмеркаваньня пытаньняў, якія зьвязаны з дзейасьцю мясцовых устаноў і арганізацыйна і да абмеркаваньня якіх сэкцыя можа зрабіць папярэдняе абсьледваньне, павінны абавязкова запрашацца прадстаўнікі гэтых устаноў і арганізацый. Калі абмяркоўваецца пытаньне, якое ўваходзіць у якой-небудзь меры ў кампэтэнцыю іншай сэкцыі, абавязкова запрашаюцца прадстаўнікі апошняй або склікаецца аб'яднанае пасяджэньне гэтых сэкцый пад старшынствам старшыні сельскага (местачковага) савету.

23. Мерапрыемствы і пастановы сэкцый зацьвярджаюцца сельскім (местачковым) саветам або яго прэзыдыумам, пасьля чаго яны ажыцьцяўляюцца саветам у вызначаемым ім парадку.

24. Сэкцыі аб сваёй дзейнасьці павінны рабіць ня менш аднаго разу ў тры месяцы даклады сельскаму (местачковаму) савету або яго прэзыдыуму, а перад працоўным насельніцтвам—у тэрміны, устаноўленыя сельскім саветам для правядзеньня справаздачнай кампаніі.

Члены сэкцый павінны даваць сваім выбаршчыкам сыстэматычныя справаздачы аб іх асабістай дзейнасьці ў сэкцыі. Прымацаваныя да сэкцый даюць такія-ж справаздачы сваім прадпрыемствам, установам, арганізацыям, саўгасам, калгасам і г. д.

25. Сэкцыі свайго тэхнічнага апарату ня маюць і ў неабходных выпадках карыстаюцца апаратам сельскага (местачковага) савету. Справы сэкцый захоўваюцца ў сельскім (местачковым) савеце.

26. Члены сэкцый, а таксама старшыні і сакратары сэкцый свае абавязкі ў сэкцыях выконваюць бясплатна.

27. Раённы выканаўчы камітэт, яго аддзелы, часткі і інструктары ажыцьцяляюць кіраўніцтва работай сэкцый праз сельскія (местачковыя) саветы і іх прэзыдыумы.

## Пра работу паасобных сэкцый

### 1. Пра сельска-гаспадарчыя вытворчыя нарады

28. Сельска-гаспадарчыя вытворчыя нарады маюць на мэце распрацоўкі і ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў па сацыялістычным перабудаваньні сельскай гаспадаркі свайго раёну (арганізацыя савецкіх гаспадарак, калгасу, машына-трактарных станцый і г. д.), а таксама мерапрыемстваў па пашырэньні засеўных плошчаў, падняцьці ўраджайнасьці, разьвіцьці жывёлагадоўлі, стварэньні кармавой базы і разьвіцьці іншых галін сельскай гаспадаркі свайго раёну, у залежнасьці ад яго спэцыялізацыі.

Сваю работу сельска-гаспадарчыя вытворчыя нарады павінны праводзіць на падставе клясавай палітыкі савецкай улады.

29. У галіне калектывізацыі сельскай гаспадаркі вытворчая нарада: а) усімі спосабамі дапамагае існуючым савецкім гаспадаркам і арганізуе шырокае грамадзкае падтрыманьне будаўніцтва савецкіх гаспадарак; б) дапамагае арганізацыі калгасаў, замацаваньню існуючых калгасаў, а таксама іх узбуйненьню і пераводу простых вытворчых аб'яднаньняў у вышэйшыя формы; в) дапамагае арганізацыі суцэльнай калектывізацыі цэлых вёсак і саветаў; г) выслухоўвае і абмяркоўвае планы работ савецкіх гаспадарак і калгасаў і справаздачы аб іх рабоце; д) дапамагае арганізацыі працы ў калгасах шляхам пераводу на зьдельшчыну, аплаты працы ў працаднёх, пераходу да сацыялістычных мэтодаў працы (соцпаборніцтва, ударніцтва і г. д.); е) дапамагае забясьпечаньню саўгасаў рабочай сілай.

30. У галіне арганізацыі дапамогі беднаце і батрацтву сельска-гаспадарчая вытворчая нарада: а) распрацоўвае мерапрыемствы для грамадзкай дапамогі беднаце ў засеўных і ўборачных кампаніі, б) выяўляе кабальныя дагаворы і выпадкі ўтоенай арэнды зямлі, в) дапамагае камітэтам сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі і іншым грамадзкім арганізацыям у справе дапамогі батрацтву і беднаце, дапамагае ўцягненьню іх у калгасы і ў іншы вытворчыя аб'яднаньні і каапэрацыю і г. д.

31. У галіне ўздыму сельскай гаспадаркі свайго раёну, павялічэньня ўраджайнасьці, пашырэньня засеўных плошчаў і агульнага ўздыму саўгасаў, калгасаў і бядняцкіх і сераднякіх гаспадарак сельска-гаспадарчая вытворчая нарада: а) распрацоўвае мерапрыемствы па ўтварэньні і захаваньні страхавых, насенных фондаў і фондаў КСУ, па арганізацыі пракатных, збожжа - ачышчальных, уборачных злучных і інш. пунктаў грамадзкага карыстаньня, арганізацыі і ўтварэньні суцэльных гатункоўных засеваў, па пашырэньні пасеваў любіну, карапляпдоў, гародніны і г. д.; б) ужывае захады праз адпаведныя арганізацыі для забесьпячэньня саўгасаў, калгасаў, бядняцкіх і сераднякіх гаспадарак машынамі, прыладамі, мінэральнымі ўгнаеньнямі, насеньнем і іншымі сродкамі вытворчасьці, а таксама для найбольш поўнага і мэтазгоднага скарыстаньня наяўных сродкаў вытворчасьці (арганізацыя груп беднаты для калектыўнага скарыстаньня інвэнтару і маніны, якія належаць індывідуальным, а таксама савецкім і калектыўным гаспадаркам); в) дапамагае правядзеньню кантрактацыі ў межах свай га раёну і разглядае з гэтаю мэтаю дагаворы аб кантрактацыі, якія павінны заключацца; г) распрацоўвае для свайго раёну мінімум агракультурных і жывёлагадоўчых мерапрыемстваў, якія павінны ажыцьцяўляцца ў абавязковым парадку або на падставе дагавораў аб спаборніцтве, і нагляджае за ажыцьцяўленьнем гэтых мерапрыемстваў, распрацоўвае планы знаёмленьня з сельска-гаспадарчымі шкодніками (палёў, гародаў і захаваньняў збожжа); д) шукае спосабы найбольш мэтазгоднага скарыстаньня мясцовых угнаеньняў—торфу, попелу, аграруд, спосабы захаваньня гною, вапнаваньне і г. д.; е) абмяркоўвае пытаньні фінансаваньня і крэдытаваньня калгасаў, вытворчых першапачатковых таварыстваў і бядняцка-сераднякіх гаспадарак, ж) распрацоўвае мерапрыемствы для ўцягненьня сродкаў самога насельніцтва на агракультурныя вытворчыя патрэбы, з) удзельнічае ў распрацоўцы канкрэтных плянаў мерапрыемстваў для ажыцьцяўленьня іх у калгасах і іншых вытворчыя аб'яднаньні і каапэрацыю і г. д.

### 2. Пра работу вытворчага абслугоўваньня савецкімі і калектыўнымі гаспадаркамі бядняцкіх і сераднякіх гаспадарак

і) распрацоўвае мерапрыемствы для ліквідацыі аграпісьменнасьці і пашырэньня агрыкультурных ведаў сярод насельніцтва праз арганізацыю дасьледча-паказальных вучасткаў, сельска-гаспадарчых гурткоў, курсаў, гутарак, дакладаў, выставак, экскурсій і г. д.);

к) распрацоўвае мерапрыемствы для прэмяваньня савецкіх, калектыўных і індывідуальных бядняцкіх і сераднякіх гаспадарак за каштоўныя палепшаньні ў справе сельскай гаспадаркі;

л) выяўляе натуўжыткоўныя і гаспадарча-нескарыстаныя землі для належнага іх скарыстаньня, м) арганізуе сацыялістычнае спаборніцтва паміж савецкімі і калектыўнымі гаспадаркамі і паселішчамі, н) распрацоўвае канкрэтныя пляны правядзеньня засеўных і ўборачных кампаній і дню ўраджаю, о) азнаямляе сялянскі актыў з мерапрыемствамі ўраду для ўздыму сельскай гаспадаркі, п) ужывае захады да правільнага і беражлівага скарыстаньня трактароў і інш. с.-гаспадарчых машын; р) падводзіць і абмяркоўвае вынікі па ажыцьцяўленьні мерапрыемстваў па ўздыму ўраджайнасьці; с) ужывае захады па падрыхтоўцы кадраў масавай кваліфікацыі.

32. У галіне палепшаньня жывёлагадоўлі сельска-гаспадарчая вытворчая нарада: а) дапамагае арганізацыі спэцыялізаваных савецкіх і калектыўных жывёлагадоўчых гаспадарак (малочных і сьвінаводных фэрм, каняводных, трусаводных, птушкаводных і інш.), б) ажыцьцяўляе мерапрыемствы па разьвіцьці ўсіх відаў жывёлагадоўлі, шляхам павялічэньня плошчы засеву кармавых культур, утварэньня штучных выпасаў, палепшаньня сенажацяў і выпасаў, сіласаваньня, нагляду за эканомным скарыстаньнем кармоў, устанаўленьня кармавых норм і г. д.; в) ужывае захады да камплектаваньня малочных і сьвінаводных фэрм па палепшаньні жывёлы (мэтызацыя, адбор, належнае выкарыстаньне племянных і палепшаных вытворнікаў), на арганізацыі правільнага догляду і ўтрыманьні жывёлы, асабліва маладняку (арганізацыя калектыўных жывёлагадоўчых двароў, малочных і злучных пунктаў і інш.), г) дапамагае будаўніцтву памяшканьняў для жывёлы, садзейнічае адачы таварной прадукцыі, забясьпячэньню падвышэньня прадукцыйнасьці жывёлы, д) дапамагае правядзеньню ўсіх мерапрыемстваў Ураду ў галіне жывёлагадоўлі (спыненьне разбазаваньня і забою жывёлы, гадоўля маладняку і інш.), е) ужывае захады да змаганьня з пошасьцямі і заразнымі хваробамі, дапамагае арганізацыі прышчэпкі жывёле, нагляд ды за арганізацыяй жывёльных могілак і іх належным утрыманьнем і г. д.; ж) падводзіць дакладны падлік вытворчай дзейнасьці жывёлаводчых і сьвінаводчых саўгасаў і калгасаў.

33. У галіне мэліярацыі і перасяленьня сельска-гаспадарчая вытворчая нарада: а) дапамагае распрацоўваць канкрэтныя пляны мэліярацыі, дапамагае ў арганізацыі правядзеньня мэліяратыўных работ у саўгасах, калгасах, т-вах і арганізацыі апошніх; распрацоўвае канкрэтныя мерапрыемствы па праёльнай эксплёатацыі і ахове гідратэхнічных пабудоў і дапамагае правільнай эксплёатацыі сенажацяў, б) абмяркоўвае складзеныя земляўпарадкаўчыя праэкты саўгасаў, калгасаў і дапамагае аб'яднаньню ў с.-г. калектывы перасяленцаў.

34. У галіне лясной гаспадаркі сельска-гаспадарчая вытворчая нарада: а) распрацоўвае разам з лясьнічымі мерапрыемствы для ўпарадкаваньня лясоў мясцовага значэньня і правільнай эксплёатацыі іх і дапамагае лесагатоўкам, б) вызначае і абмяркоўвае мерапрыемствы для разьвіцьця лесу і змаганьня з лесапарубкамі, в) дапамагае арганізацыі аховы лясоў мясцовага значэньня і дапамагае сельскаму савету і лясным органам у змаганьні з лясьнымі парубкамі і лясьнымі пажарамі.

35. Беспасрэднае кіраваньне і нагляд за правядзеньнем агрыкультурных і заатэхнічных мерапрыемстваў ажыцьцяўляецца агра і заатэхнікамі, якія дзейнічаюць на падставе асобных аб іх палажэньняў.

## II. Пра савет культурнага будаўніцтва

36. На савет культурнага будаўніцтва ўскладаецца абавязак разгортваньня масавай работы вакол калектывізацыі сельскай гаспадаркі, распрацоўка і ўжываньне практычных мерапрыемстваў, накіраваных на падняцьце культурнага і палітычнага ўзроўню працоўнага насельніцтва, як-та:

а) разгортваньне масавай растлумачальнай работы аб сутнасьці ленінскай нацыянальнай палітыкі, значэньні беларусізацыі, каранізацыі і абслугоўваньня нацменшасьцей на іх роднай мове; ужываньне практычных мерапрыемстваў па інтэрнацыянальна-клясавым і антырэлігійным выхаваньні шырокіх працоўных мас;

б) разгортваньне шырока-масавай агітацыйна-растлумачальнай работы аб палітычным значэньні калектывізацыі, усеагульнага навучаньня, папулярызацыя сярод працоўнага насельніцтва пастаноў партыі і ўраду па тэтых пытаньнях, па пытаньні палітэхнізацыі школ і інш.;

в) распрацоўка і ажыцьцяўленьне канкрэтных мерапрыемстваў па правядзеньні ўсеагульнага навучаньня на роднай мове на прадпрыемствах, машына-трактарных станцыях, у саўгасах, калгасах і іншых паселішчах, вучот і складаньне сьпісаў дзяцей адпаведнага ўзросту, нагляд за абавязковым наведваньнем імі школ, барацьба з парушэньнямі заканадаўства аб абавязковым навучаньні;

г) выяўленьне ўзелу саўгасаў, калгасаў, машына-трактарных станцый, прафсаюзаў, каапэрацыі і іншых грамадзкіх арганізацый у справе ўсеагульнага навучаньня, разгляд іх пляноў і складзеных на падставе гэтых плянаў адзіных плянаў усеагульнага навучаньня на тэрыторыі савету, з вызначэньнем канкрэтных заданьняў кожнай арганізацыі і адпаведных асыгнаваньняў гэтай арганізацыі;

д) разгляд каштарысаў і аб'яднаньне сродкаў усіх арганізацый, якія вядуць культурную работу, (складаньне адзінага фінпляну) і падшуканьне дадатковых сродкаў у парадку прыцягненьня да гэтай работы грамадзкасьці;

е) арганізацыя для выкананьня задач культурнага будаўніцтва культпаходаў, культэстафэты і інш.;

ж) арганізацыя дашкольнага выхаваньня, у першую чаргу у аграмаджаных сэктарах, сыстэматычны нагляд за яго пастаноўкай;

з) садзейнічаньне і нагляд за ажыцьцяўленьнем пастаноў аб палітэхнізацыі школ, ужываньне захадаў да адпаведнага абсталяваньня школ і культасьветных устаноў, набыцьця прылад, інструмэнтаў і г. д.;

і) садзейнічаньне сельскім местачковым) культурна-асьветным установам і арганізацыям у іх рабоце;

к) распрацоўка праэктаў арганізацыі новых школ, школ ліквідацыі непісьменнасьці, хат-чытальняў, кіно і радыё-установак, і іншых культурна-асьветных устаноў, забясьпечваючы гэтымі ўстановамі ў першую чаргу саўгасы і антырэлігійным выхаваньні шырокіх працоўных мас;

л) распрацоўка плянаў будаўніцтва новых і рамонту старых культасьветных устаноў; мабілізацыя грамадзкасьці на выкананьне гэтых плянаў (вывазка будаўнічых матар'ялаў, збор сродкаў і інш.); сыстэматычны нагляд за ходам будаўніцтва;

м) ужываньне захадаў да забесьпячэньня школьнікаў—дзяцей рабочых, батракоў, калгаснікаў і сялян-беднякоў інтэрнатамі, абуткам, вапраткай і гарачымі сьнеданьнямі;

н) удзел, шляхам прымацаваньня паасобных членаў сэкцыі, у пасяджэньнях саветаў культурна-асьветных устаноў, (школ, хат-чытальняў), народных дамоў, дамоў селяніна);

о) падлік непісьменных дарослага насельніцтва і ўдзел у ліквідацыі агульнай і палітычнай непісьменнасьці, у першую чаргу сярод рабочых, батрацтва, калгаснікаў і беднаты;

п) арганізацыі выпускі (асабліва калектыўнай) газэт, часопісаў і іншай перыядычнай і непэрыядычнай літаратуры на беларускай мове і мовах нацменшасьцей і нагляд за своячасовай і якуратнай дастаўкай яе;

р) садзейнічаньне арганізацыі і дзейнасьці ячэек «Моопра», «Асаавіяхіма», «Прыхільнік Дзяцей» і іншых грамадзкіх арганізацый.

с) арганізацыя і садзейнічаньне выпуску насьценных газэт і асьвятленьне ў іх, а таксама ў мясцовай і цэнтральных газэтах, дзейнасьці савета;

т) арганізацыя гурткоў: драматычных, мухычных, харавых, фізкультурных, музычных, харавых, фізкультурных;

у) дапамога ў справе барацьбы з непаўналетнімі правапарушэньнямі, з бязпрытульнасьцю ,падлік гэтых дзяцей і абсьледваньне умоў іх жыцьця; нагляд за становішчам і дзейнасьцю дзіцячых дамоў і дапамога ў іх рабоце;

ф) абсьледваньне ўмоў жыцьця дзяцей, узятых на працоўнае выхаваньне калектыўнымі гаспадаркамі і індывідуальнымі сялянскімі гаспадаркамі, дзяцей, якія знаходзяцца пад апекай і ўсыноўленых дзяцей;

х) абсьледваньне асоб і маемасьці, над якімі павінна быць устаноўлена апека або папячыцельства, выкрыцьцё такіх асоб і маемасьці, вылучэньне па асабістай ініцыятыве кандыдатаў у апякуны або папячыцелі, кантроль за дзейнасьцю апякуноў і папячыцеляў, праверка іх справаздач;

ц) правядзеньне работы па арганізацыі школ і гурткоў па аўладаньні апаратэхнікай;

ч) ужываньне захадаў да ўкамплектаваньня школ і культасьветных устаноў кадрамі; вылучэньне на гэтую работу лепшых культармейцаў; арганізацыя работы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў;

ш) практычная дапамога сельскім (местачковым) саветам у вырашэньні розных іншых пытаньняў ,вызначаных у 33 арт. Палажэньня пра сельскія саветы ў галіне культурна-асьветнага кіраўніцтва і залучэньне да ўдзелу ў гэтым вырашэньні шырокіх мас рабочых, батракоў, калгаснікаў і працоўнай беднаты.

## III. Пра сэкцыю па справах сацыяльных і дабрабыту

37. На сэкцыю па справах сацыяльных і дабрабыту ўскладаецца:

а) нагляд за работай сельскіх (местачковых) мэдыка-санітарных устаноў і арганізацый і садзейнічаньне іх рабоце;

б) распрацоўка праэктаў арганізацыі на тэрыторыі саветаў і ў першую чаргу ў саўгасах і калгасах новых больніц, амбуляторый, фэльчарскіх пунктаў і іншых мэдыка-санітарных устаноў;

в) удзел у арганізацыі і правядзеньні розных грамадзкіх кампаній (барацьба з сухотамі, трахомай, тыдні чыстаты і інш.), пабудова студняй, грамадзкіх лазьняў і да т. п.;

г) арганізацыя санітарных гурткоў і правядзеньне вырокай санітарнай прапаганды сярод насельніцтва;

д) распрацоўка мерапрыемстваў па палепшаньні матар'яльнага становішча інвалідаў вайны, партызан, б. чырвонагвардэйцаў, сем'яў загінуўшых вае наслужачых, сем'яў чырвонаармейцаў, а таксама састарэлых асоб; арганізацыя дапамогі асобам, якія пацярпелі ад стыхійных бядот;

е) арганізацыя грамадзкага харчаваньня і іншых бытавых устаноў у саўгасах, калгасах і г. д.;

ж) распрацоўка праэктаў абавязковых пастаноў па пытаньнях дабрабыту і падача іх на разгляд сельскага (местачковага) савету;

з) нагляд за становішчам дарог, мастоў, пераправаў ,грамадзкіх будынкаў, школ, хат-чытальняў і іншых пабудоў, распрацоўка прапаноў і каштарысаў па іх рамонце і ахове;

і) перыядычныя абсьледваньні санітарнага становішча калгасаў, саўгасаў, паасобных хат і двароў, студняў, утрыманьня ў парадку пячэй, дымаходзіў і інш., арганізацыя супрацьпажарных мерапрыемстваў, стварэньне пажарных дружын, садзейнічаньне набыцьцю пажарнага інструменту і г. д.;

к) распрацоўка практычных мерапрыемстваў па ўтрыманьні ў чыстаце пляцоў ,вуліц ,школ, лазьняў, хат-чытальняў, каапэратываў, лекавых і інш. устаноў, а таксама такіх месц грамадзкага карыстаньня як рэчкі, студні, рошчы і інш.;

л) нагляд на выпаўненьнем будаўнічых і пажарных правіл, правільнай расплянёўкай новых паселішчаў і асабліва пабудоў у калгасах;

м) садзейнічаньне разьвіцьцю агітрыкультура будаўніцтва на тэрыторыі саветаў.

## IV. Пра сэкцыю па справах фінансава-бюджэтных

38. На сэкцыю па справах фінансава-бюджэтных у галіне фінансава-бюджэтнай ускладаецца садзейнічаньне правільнаму ажыцьцяўленьню на тэрыторыі савету фінансавай і падатковай палітыкі партыі і савецкай улады, садзейнічаньне мабілізацыі сродкаў насельніцтва для забесьпячэньня далейшага пасьляховага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва. Для выкананьня гэтых задач на сэкцыю ўскладаецца:

а) удзел у складаньні сельскіх (местачковых) бюджэтаў і ў выяўленьні даходных крыніц;

б) папярэдні разгляд праэктаў каштарысаў усіх сельскіх (местачковых) устаноў і прадпрыемстваў — больніц, фэльчарскіх пунктаў, школ, хат-чытальняў, народных дамоў і інш. і дача заключэньняў па праэктах гэтых каштарысаў;

в) складаньне праэктаў скарыстаньня сродкаў, якія сабраны ў парадку самаабкладаньня;

г) удзел у складаньні сьпісаў асоб, устаноў і арганізацый ,якія падлягаюць абкладаньню рознымі дзяржаўнымі (апроч сельска-гаспадарчага) падаткамі;

д) практычны ўдзел у правядзеньні на тэрыторыі савету адзінага сельска-гаспадарчага падатку, выяўленьні кулацкіх гаспадарак і дапамога ў правядзеньні клясавага прынцыпу ў прыстасаваньні падатковага заканадаўства;

е) садзейнічаньне сельскай падатковай камісіі ў галіне вучоту аб'ектаў аб хлапаньня, правядзеньні абсьледваньняў на скаргах на няправільны вучот аб'ектаў абкладаньня і на вылучэньне падаткаў, а таксама на пытаньнях льгот;

ж) садзейнічаньне разьвіцьцю страхаваньня будынкаў, насеваў, жывёлы і інш.;

з) азнаямленьне працоўных з падатковым заканадаўствам і папулярызацыя льгот ,якія гэта заканадаўства дае калгасам, беднаце і паасобным бядняцка-сераднякцкім гаспадаркам;

і) ужываньне практычных захадаў да поўнага выкананьня ўсім прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі фінансавага пляну, нагляд за захаваньнем бюджэтнай дысцыпліны.

39. На сэкцыю па справах фінансава-бюджэтных у галіне садзейнічаньня дзяржрэдыту і ашчаднай справе ўскладаецца:

а) садзейнічаньне індустрыялізацыі народнай гаспадаркі шляхам шырокай мабілізацыі сродкаў насельніцтва праз распаўсюджваньне дзяржаўных пазык, уцягненьне ўкладаў у ашчадныя касы, удзел у распаўсюджваньні акцый трак тарацэнтру, папярэдняй падпіскі на сельска-гаспадарчыя машыны, швэйныя машыны, вэлёсыпэды і г. д.;

б) агітацыя за трыманьне аблігацый у працягу ўсяго часу, на які выпушчана пазыка, арганізацыя дакладаў і гутарак па пытаньнях мабілізацыі сродкаў, наладжваньні спэцыяльных выпускаў насьцэнгазэт і аддзелаў у іх, распаўсюджваньне літаратуры па пытаньнях мабілізацыі сродкаў насельніцтва;

в) утварэньне адпаведных куткоў ва ўстановах і арганізацыях і забесьпячэньне справачных пунктаў тыражнымі табліцамі і іншымі інфармацыйнымі матар'ялам;

г) ажыцьцяўленьне кантролю над работай зрэдытных і іншых устаноў па абслугоўваньні трымальнікаў пазыкі і ўкладчыкаў ашчадных кас;

д) наладжваньне абмеркаваньня пра экстаў новых мэтадаў мабілізацыі сродкаў насельніцтва;

е) арганізацыя абслугоўваньня працоўных у справе апрыманьня выйгрышаў, процантаў і сум пагашэньня, а так сама па пакупцы—продажу, закладу і здачы на захоў аблігацый, ня робячы пры гэтым ніякіх апэрацый па прыёму і выдачы грошай, фондавых каштоўнасьцяй і зьвязаных з гэтым дакумэнтаў.

## V. Пра сэкцыю па справах палепшаньня працы і быту жанчын

40. На сэкцыю па справах палепшаньня працы і быту жанчын ускладаецца:

а) уцягненьне жанчын у практычную штодзённую работу саветаў і іншых дзяржаўных устаноў, а таксама садзейнічаньне ўцягненьню жанчын у работу прафэсыйных ,калгасных, каапэрацыйных і інш. грамадзкіх арганізацый; практычная дапамога вылучэнкам у іх штодзённай рабоце;

б) садзейнічаньне ўцягненьню, падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы жаночай рабочай сілы для прамысловасьці, сельскай гаспадаркі, іншых галін народнай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва; актыўны ўдзел у вылучэньні жанчын на кіруючую работу;

в) рашучае ажыцьцяў

## У бой за торф




## Апартуністычнае кіраўніцтва заводу „Шлях сацыялізму“ павінна быць абноўлена

Торфазавод «Шлях Сацыялізму» выканаў гадавога задання па выпрацоўцы торфу выканаў толькі на 30 проц., а дзённае заданьне на 13-га ліпеня выкананa на 47,7 проц.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва на заводзе не адчуваецца бо ім тарфком дрэнна кіруе. Да сёньняшняга дню завод яшчэ ня ўключыўся ва ўсесаюзны конкурс.

Назіраецца шмат прастояў і па вінэ саміх рабочых. Параўшчык праспаў на 4 гадзіны і брыгада ў колькасьці 30 чал. таксама прагуляла 4 гадзіны.

Прапановы рабочых ляжаць у стале тэхнарука бяз руху; імі ніхто ня цікавіцца ў той час, калі ёсьць шмат каштоўных прапаноў, якія маглі-б паскорыць і палепшыць выпрацоўку торфу.

**Да сёньняшняга дню яшчэ не распрацавана прамова тав. Сталіна і пастанова ўраду аб адхоўніках, што магло замацаваць рабочых да канца сэзона і гэтым самым зьнішчыць вялікую цякучасьць рабочай сілы якая маецца на заводзе.**

На заводзе наглядаюцца нядбайныя адносіны да работы з боку інжынэра Кірычэнкі і камсамольца тарфмэйстара Петрачэнкі. Яны пачалі распрацоўку поля для здабываньня фрэзернага торфу, зьнялі адчос з 5 карт, што абышлося ў 3.000 руб. У выніку гэты торф аказаўся няпрыгодным, бо замест 8 проц. зольнасьці маецца 38—40 проц. і гэты вучастак цяпер прышлося закрыць.

Сталоўкі, што абслугоўваюць рабочых заводу, працуюць таксама дрэнна. Прадукты ёсьць, але іх несвяжачасова дастаўляюць. Якасьць абедаў вельмі дрэнная.

На заводзе арганізавана камуністычна-камсамольская арцель, але на не шляху работы маецца шмат перашкод, прыкладна: для працы патрэбна 190 дошак да транспарцёру, а арцель працуе на 80 дошках, што перашкаджае рабоце.

**Торфазавод да сёньняшняга дню не перайшоў яшчэ на гаспадарчы разьлік. Арцелі і рамкі таксама не пераведзены. На заводзе існуе падзённая работа, у той час калі ўжо даўно трэба было пераведсьці на зьдзельшчыну.**

Есьць на заводзе частка арцеляй, якія ня маюць свайго прамфінпляну і нават прамфінплян не даведзен да кожнага тарфяніка і тарфяніцы. Арцелі **Арцёмава і. Каварды** па машынафармоачным торфе перавыконваюць свой прамфінплян. Замест 36.000 цэглаў заданьня, даюць 40-45 тысяч цэглаў. Перавыконвае свой прамфінплян і арцель **Саладухіна** малага гідратарфу. Астатнім арцелям патрэбна ўзяць прыклад з гэтай арцелі і павесьці барацьбу з ілжэ-ўдарнікамі, рвачамі і прагульшчыкамі.

Дрэнна абстаіць справа з падрыхтоўкай кадраў. На заводзе маецца ФЗУ; работа яго магла даць шмат лепшага, але загадчык ФЗУ **Макарэвіч** зусім ня цікавіцца становішчам ФЗУ, ня кіруе ім, адсюль і дысцыпліна ФЗУ зусім адсутнічае.

Завод патрэбу адчувае ў замене кіраўніцтва. Кіраўніцтва павінна быць абноўлена.

**М. К.**

## ДЗЁННАЯ ЗВОДКА

### па выпрацоўцы торфу на найбольш буйных торфазаводах БССР

*на 12-VII-1931 году.*

| | Процант выканаўня пляну |
|---|---|
| 1. Бальшавік | 43,6 |
| 2. Грэбянёва | 30,5 |
| 3. Давыдаўка | 48,4 |
| 4. Закрашынскі Мох | 58,3 |
| 5. Чырвоны Кастрычнік | 13,2 |
| 6. Чырвоны Сьцяг | 13,0 |
| 7. Асінторф | 31,2 |
| 8. Чырвоны Тарфянік | 105,9 |
| 9. Шлях Сацыялізму | 47,7 |

# Перабудова работы спажыўкаапэрацыі—

## баявая задача ўсёй пралетарскай грамадзкасьці

### У ПЯЦІДЗЁНЬНІЧ АГЛЯДУ СПАЖЫЎКААПЭРАЦЫЯ ПАВІННА ПЕРАЙСЬЦІ АД ПАПЯРОВЫХ АБЕЖНІКАЎ ДА РЭАЛЬНЫХ ДЗЕЯНЬНЯЎ

## Рабселькоры! арганізуйце ўдарныя брыгады друку да ўсебеларускага рэйду!

**2 усебеларускі зьезд рабсельваенкораў пастанавіў у сувязі з правядзеньнем пяцідзёньніка агляду каапэрацыі арганізаваць 22 ліпеня ўсебеларускі рэйд ударных брыгад друку па праверцы выкананьня рашэньняў партыі і ўраду аб перабудове спажывецкай каапэрацыі.**

**Рабселькоры! Арганізуйце ўдарныя брыгады друку, рыхтуйцеся да ўсебеларускага рэйду!**

## Дагэтуль поўнасьцю не падрыхтаваны хавальнікі, тара

Агульная патрэбнасьць бульбы і гародніны для працоўнага насельніцтва гораду Менску складае больш 80 тысяч тон. З гэтай колькасьці патрэбна хаваць на зімовы і вясновы час 11 тысяч тон бульбы, 5 тысяч тон капусты і паўтары тысячы тон гуркоў. На сёньняшні дзень ЦРК забясьпечан уся го на 60 процантаў хавальнікамі. Для астатняй колькасьці Менскі ЦРК толькі думае падшукаць памяшканьне. Між тым і для падрыхтоўкі ўжо маючыхся памяшканьняў нічога ня зроблена. Рамонт і дэзынфэкцыя «ў праэкце», а тэрмін, устаноўлены Гарсаветам, каб гэтую работу скончыць да 1-га ліпеня, ўжо прайшоў...

Вельмі дрэнна абстаіць справа з забясьпячэньнем тараю. Бочкамі ЦРК забясьпечан на 50 проц. Мяккай тары замест 75 тысяч мяхоў маецца ўсяго 10 тысяч. МЦРК амаль што нічога не зрабіў, каб у правадзімы месячнік тары сапраўды мабілізаваць тару, маючуюся па жактах і па прадпрыемствах Менску.

МЦРК мае магчымасьць атрымаць праз Садгародніну вялікую колькасьць кошыкаў, але да гэтага часу ніякага дагавара на гэта не заключана.

Па кантрольных лічбах Менскі ЦРК павінен сабраць авансаў на гародніну ад працоўнага насельніцтва на 100 тысяч рублёў. Сабрана ўсяго 57 проц. заданьня.

Трэба з усёй сур'ёзнасьцю адзначыць, што адно з важнейшых палітычна-гаспадарчых мерапрыемстваў—пляны прыёму масавага паступленьня садагароднінны—пакуль што марынуецца ў цішы цэрабкопаўскіх табінэтаў. Калектыў і нізавыя прафарганізацыі на мясцох не ўцягнуты ў падшуканьне хавальнікаў, у ажыцьцяўленьне рабочага кантролю над прывядзеньнем у парадак маючыхся хавальнікаў.

Згодна пастановы Гарсавету, у асеньні час МЦРК, ЗРК і ТПО павінны раздаць насельніцтву ня менш 50 проц. нормы садагароднінны. Але ніякай работы па мабілізацыі працоўнага насельніцтва да падрыхтоўкі кожным рабочым і служачым месца для хаваньня ні з боку каапкамісіі, ні з боку прафарганізацыі не праведзена.

У сучасны момант МЦРК заключае дагаворы з асобнымі райкаапсаюзамі на атрыманьне садагароднінны. Да Менскага ЦРК прымацованы Менскі, Сьмілавіцкі, Койданаўскі, Пухавіцкі, Ўзьвдзенскі, Заслаўскі і Лагойскі раёны.

Белсадсаюз прапануе заключаць умовы згодна плянаў кантрактацыі, але МЦРК лічыць, што згодна фактычнага вучоту пасеву будуць вялікія разыходжаньні, і па гэтаму патрэбна заключаць умовы на фактычны засеў. Ня гледзячы на тое, што Сьмілавіцкі раён ліквідуецца, Белсадсаюз прапануе МЦРК заключыць дагавор з ім, з тым, каб потым ліквідацыйная камісія разабралася...

Да МЦРК прымацованы для непляновых загатовак Пухавіцкі і Слуцкі раёны, але да гэтага часу мясцовыя арганізацыі не дапушчаюць да загатовак, бо па іх думцы гэта можа парушыць плянавыя загатоўкі.

Усе гэтыя факты сыгналізуюць, аб тым, што ў справе садагароднінны маецца цэлы рад прарываў, якія могуць хваравіта адбіцца на рабочым забясьпячэньні.

**Л.**

## Разгарнуць масавую работу вакол агляду перабудовы каапэрацыі

### (З пастановы прэзыдыуму ЦСПСБ па пытаньні аб дэкадніку агляду перабудовы работы каапэрацыі)

**У мэтах рашучай праверкі выкананьня пастановы ЦК, СНК і Цэнтрасаюзу аб перабудове работы каапэрацыі—прыняць прапанову рабочых гумова-вытворчага заводу «Чырвоны Багатыр» аб арганізацыі агляду спажыўкаапэрацыі, уключыўшыся ў абвешчаны ўсеЦСПС дэкаднік агляду праверкі работы каапэрацыі.**

**Для гэтай мэты стварыць рабочыя брыгады, якія павінны праверыць становішча ходу перабудовы каапэрацыі, узяўшы ў аснову наступныя пытаньні:**

**а) практычнае ажыцьцяўленьне таспадарчага разьліку (магазыны, склады); б) выдзяленьне аб'яднаньняў і сэкцый; в) арганізацыя пераважнага забесьпячэньня важнейшых прадпрыемстваў, ударных цэхаў і асобных ударнікаў; г) стварэньне асобных ЗРК для лесадрэўрабочых і торфарабочых; д) разгортваньне самастойнай загатоўкі ЗРК; е) праверка таваразвароту (ці маецца затаварваньне); ж) як галінныя аб'яднаньні разгортваюць спэцыялізаваную гандлёвую сетку; з) як праводзіцца новая сыстэма аплаты працы; і) як перабудавалі прафарганізацыі работу ў залежнасьці з пастановай ЦК і СНК; к) перабудова грамадзкага кар чаваньня (палепшаньне якасьці абедаў, пераход на паблюдны водпуск абедаў, разгортваньне падсобных прадпрыемстваў).**

**ЦСПСБ лічыць, што ўся работа павінна прайсьці пад пунктам погляду разгортваньня сацспаборніцтва паміж асобнымі саюзамі і каапэрацыйнымі арганізацыямі, не абмяжоўваючыся толькі фіксацыяй паасобных недахопаў, а самым рашучым чынам пры садзейнічаньні рабочых брыгад, тэрмінова выпраўляць усе недахопы на мясцох.**

# ЗАСТАЛОСЯ ПАЎТАРЫ ДЭКАДЫ

## да сканчэньня пазыковай кампаніі, а рэалізацыя пазыкі ў вёсцы ўсё яшчэ праходзіць недапушчальна марудлівымі тэмпамі.—Раўняйцеся па Клімаўшчыне, дзе пабальшавіцку змагаюцца за фінансаваньне сацыялістычнага будаўніцтва

## Узьняць тэмпы рэалізацыі пазыкі на вёсцы

### Усім райкомам і гаркомам КП(б)Б

Рэалізацыя пазыкі «Трэцяга рашаючага» ў вёсцы, асабліва сярод адназасобнікаў, у вашым раёне пад пагрозай зрыву, у зьвязку з бязьдзейнасьцю райкамсоўдаў, калгасных арганізацый, адсутнасьцю масавай работы, шэфства ўдарных брыгад, сацспаборніцтва.

Адначасова ня скончаны поўны ахоп пазыкай рабочых і служачых. Недапушчальна адстае неарганізаваны сэктар гораду. Гэта тлумачыцца адсутнасьцю ўвагі гэтай кампаніі з боку партыйных і энэргічнага кіраўніцтва кампаніяй з боку райкому.

ЦК КП(б)Б прапануе пад асабістую адказнасьць сакратара райкому ўзьняць кампанію на належную вышыню, мабілізаваць апарат і грамадзкасьць, узмацніць тэмпы з разьлікам сканчэньня кампаніі ў вёсцы да 1-га жніўня. Зьвяртаем увагу на недастатковы ахоп падпіскай адпускнікоў сэзоньнікаў і новых кадраў.

Вывесці пералому мы павінны атрымаць у чарговай інфармацыі.

**Шаранговіч.**

## Аб шырокай папулярызацыі конкурсу на лепшую камісію садзейнічаньня, грамадзкага інструктара і райгазэту

### Усім райкомам і гаркомам КП(б)Б

З мэтай узьняцьця грамадзкай думкі вакол выкананьня фінпляну, ашчадкас і рэалізацыі пазыкі «3-га рашаючага году пяцігодкі», цэнтральная камісія садзейнічаньня абвешчан конкурс на лепшыя камісіі садзейнічаньня (раённыя, грамадзкія, пры с.-с., пры калгасах, прадпрыемствах), раённую газэту і грамадзкага інструктара па ашчадсправе і дзяржкрэдыту.

Умовы конкурсу апублікаваны ў газэце «Зьвязда» ад 27 чэрвеня 1931 г., № 171.

Да гэтага часу конкурс зусім не папулярызаваны на месцы, што пагражае яго зрыву.

Надаючы вельмі важнае палітычнае і практычнае значэньне конкурсу, ЦК КП(б)Б прапануе, узяўшы ход яго пад непасрэдным нагляд РК і ГК КП(б)Б, прыняць захады да ўключэньня ў конкурс усёй грамадзкасьці, забясьпечыўшы масавы характар конкурснага агляду работы ў галіне ашчадсправы і дзяржкрэдыту, які ў сувязі з конкурсам будзе праводзіцца.

Асноўныя мэты агляду і конкурсу: актывізацыя грамадзкасьці ў галіне разьвіцьця ашчадсправы і дзяржкрэдыту і скарыстаньне яго для забесьпячэньня выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва, асабліва поўнага выкананьня заданьня па рэалізацыі пазыкі. Разам з гэтым у выніку конкурснага агляду павінна быць дасягнута рашучае палепшаньне работы апарату.

Неадкладна забясьпечце шырокую папулярызацыю конкурсу па лініі партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных арганізацый і камісій садзейнічаньня, арганізуйце шырокае асьвятленьне ў раённай газэце, насьценгазэтах і шмат тыражках з прыцягненьнем да гэтай справы рабселькораўскай масы.

Устанавеце нагляд за ходам агляду, пэрыядычна заслухоўваючы справаздачу райкамсода, газэты і райашчадкасы.

Аб ходзе конкурсу пэрыядычна інфармуйце ЦК КП(б)Б.

Культмасавы аддзел ЦК КП(б)Б

**Гаруновіч.**

## Папраўка

У зьмешчаным прывітаньні БДУ, у сувязі з яго 10-ці гадовым юбілеем, ад БАН («Савецкая Беларусь» ад 11 ліпеня г. г. за № 157) укралася памылка. У другім абзацы прывітаньня напісана, што «...БДУ будзе зьяўляцца сапраўдным прытулкам беларускай сацыялістычнай культуры», а трэба чытаць: «...Сапраўднай цытадэллю беларускай сацыялістычнай культуры».

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

**Дэкаднік дапамогі грамадзянскай авіяцыі**

# ГРАМАДЗЯНСКУЮ АВІЯЦЫЮ—НА СЛУЖБУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАМУ БУДАЎНІЦТВУ

## На дапамогу грамадзянскай авіяцыі

З 10 па 20 ліпеня па ініцыятыве рабочых электразаводу і ЦО—«Правда» праводзіцца дэкаднік дапамогі грамадзянскай авіяцыі.

Бурны рост усёй нашай гаспадаркі, тэрытарыяльная аддаленасьць шматлікіх абласьцей і рэспублік выклікаюць неабходнасьць хуткага, чоткага апэрацыйнага кіраўніцтва, а значыцца хуткіх сродкаў перасоўваньня. У гэтых адносінах грамадзянская авіяцыя адыгрывае галоўную ролю.

Але побач з бязумоўнымі дасягненьнямі мы маем на паасобных авіябудаўнічых заводах і будаўніцтвах аэрапортаў і аэрадромаў значныя прарывы, нявыкананьне прамфінплянаў і будплянаў.

З мэтай дасягненьня рашучага пералому ў ходзе выкананьня прамфінплянаў і будплянаў авіяцыйнай гаспадаркі праводзіцца зараз дэкаднік дапамогі грамадзянскай авіяцыі.

Гэты дэкаднік ставіць сваёй мэтай мабілізаваць шырачэзныя масы працоўных на дапамогу стварэньню магутнай грамадзянскай авіяцыі. Толькі пры ўмове актыўнага ўдзелу ўсёй савецкай грамадзкасьці мы зможам выканаць пастаўленую перад сабой задачу. Выходзіны з гэтага ўсеЦСПС і ЦС ТДА-Авіяхіму СССР зьвярнуліся з адозваю да ўсіх Савпрофаў і ўсіх членаў ТДА-Авіяхіму з прапановай у час дэкадніка правесьці шырокую растлумачальную работу сярод рабочых, служачых, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас аб становішчы, дасягненьнях і далейшых шляхох развіцьця грамадзянскай авіяцыі. **Бязумоўна адной растлумачальнай работай абмежавацца нельга. Трэба наладзіць практычную дапамогу авіязаводам і будоўлям аэрадромаў шляхам арганізацыі масавых суботнікаў.** У першую чаргу гэта датычыцца Менску і Віцебску. Менгарпрафсавет і Віцебскі гарпрафсавет павінны разам з ТДА-Авіяхімам у бліжэйшыя дні правесьці суботнікі дапамогі абсталяваньню існуючага Менскага аэрадрому і будуючагася Віцебскага аэрадрому Віцебскай Авіяшколы.

Толькі пры неадкладным выкананьні гэтых задач мы дасягнем стварэньня магутнай грамадзянскай авіяцыі.

Адначасова з гэтым трэба памятаць, што дэкаднік—гэта ня толькі кампанія, **гэта пачатак сыстэматычнай штодзённай дапамогі ўсяе савецкае грамадзкасьці справе стварэньня магутнага грамадзянскага паветранага флёту.**

**С. Гр.**

## ТДА-авіяхімаўцы, у першыя рады будаўнікоў авіяцыі

### (Са звароту ЦС ТДАХ да ўсіх членаў, ячэек і саветаў ТДА-Авіяхіму)

Будаўніцтва паветранага флёту патрабуе сталай ўвагі і садзейнічаньня шырокай савецкай грамадзкасьці. Пачын «Правды» і заклік электразаводцаў павінны быць падхоплены 10-мільённай арганізацыяй ТДА-авіяхіму.

Усе саветы ТДА-авіяхіму павінны зараз-жа пачаць кампанію па разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў авія-прамысловасьці, вылучыць для прэміяваньня лепшых ўдарнікаў, рацыяналізатараў і вынаходцаў авія-прамысловасьці спэцыяльныя фонды, устанавіць пераходныя сьцягі для ўзнагароды лепшых цэхаў заводаў.

ЦС ТДА-авіяхіму СССР, устанаўляючы пераходзячыя сьцягі для ўзнагароды лепшага авіяцыйнага заводу, перадае яго **заводу № 39 і выдзяляе ў распараджэньне ячэйкі ТДА-авіяхіму** гэтага заводу 20.000 руб. на разгортваньне работы і прэміяваньне. Ц.С. прапануе ўсім прадпрыемствам авіяпрамысловасьці ўступіць у спаборніцтва за пераходны сьцяг. Для заахвочваньня лепшых ячэек прадпрыемстваў УсеАГПФ (ўсесаюзнае аб'яднаньне грамадзянскага паветранага флёту), паасобных груп і паасобных ударнікаў мясцовыя арганізацыі павінны вылучыць спэцыяльныя фонды прэміяваньня. **З свайго боку Ц.С. вылучае 30.000 руб.**

Асноўныя задачы таварыства па сталай дапамозе УсеАГПФ — актыўны ўдзел у правядзеньні разьведкі і вышуканьня новых паветраных шляхоў, арганізацыя суботнікаў дапамогі аэрадромам, адвод аэрадромаў і пасадачных пляцовак, арганізацыя дапаможных пастоў мэтэаралёгічнай службы. 10-мільённы ТДА-авіяхімаўскі атрад савецкай грамадзкасьці павінен стаць у першыя рады будаўнікоў магутнай савецкай авіяцыі.

Генэральны сакратар саюзу ТДА-авіяхіму СССР **Л. Маліноўскі.**

Заг. авіяцыйным аддзелам **Д. Ягораў.**

## Прафсаюзы — на правядзеньне дзесяцідзёньніка

### З адозвы ЎсеЦСПС да ўсіх савпрофаў і ЦК саюзаў

Вялізарны рост сацыялістычнай прамысловасьці, саўгаснага і калгаснага будаўніцтва ў аддаленых вобласьцях і нацыянальных рэспубліках Савецкага саюзу патрабуе ўстанаўленьня найбольш шпаркай і сыстэматычнай сувязі старых і новых гаспадарча-палітычных цэнтраў краіны.

Такую сувязь можа ажыцьцявіць грамадзянская авіяцыя, абсталяваная па апошнім слове тэхнікі.

Рабочая кляса савецкай краіны можа і павінна стварыць сваю магутную грамадзянскую авіяцыю.

Надаючы [illegible] рабоце па [illegible] мае [illegible] грамадзянскай авіяцыі ЦСПС [illegible] і ініцыятыў «Правды» і рабочых Электразаводу [illegible] дзесяцідзёньніка дапамогі грамадзянскай авіяцыі і прапануе ўсім [illegible] ўдзел [illegible] правядзеньні.

Неабходна [illegible] на [illegible] дасягненьні [illegible] грамадзянскай авіяцыі [illegible] плян [illegible] практычнай дапамогі грамадзянскай авіяцыі з боку кожнага заводу.

Савпрофы Масквы, Ленінграду, Грузіі, Азэрбайджану, УСПС Уралу, Заходняй Сібіры, Усходняй Сібіры, Ніжняга Ноўгараду, Паўночнага Каўказу, Далёкага Усходу, Татрэспублікі, Казакстану, Беларусі. Заходні- і Сярэдня-Азіяцкае бюро УсеЦСПС павінны арганізаваць канкрэтнае шэфства прадпрыемстваў над аэродромамі.

Усе ЦК саюзаў і савпрофы павінны зараз-жа разгарнуць на прадпрыемствах, саўгасах і МТС шырокую работу па вярбоўцы 15.000 лепшых маладых рабочых і калгасьнікаў у школы грамадзянскай авіяцыі.

[illegible] ліпеня на ўсіх клюбах, чырвоных кутках, культбазах, садох і парках неабходна правесьці масоўкі і вечары, прысьвечаныя азнаямленьню рабочых і служачых з роляю і зьдачамі грамадзянскай авіяцыі ў сацыялістычным будаўніцтве.

Сакратар УсеЦСПС **Н. Анцыловіч.**

# НЕ ПСАВАЦЬ МАЛАКА

## Малаказавод вінен у кваснасьці дастаўлянага малака; ён прымушае здатчыкаў чакаць прыёмкі гадзінамі; флягі здае ня вымытымі; мыечныя машыны не нагружаны; інструктаваньне пастаўшчыкоў малака не наладжана; прамфінплян ня выканан

## Малаказавод патрабуе ўвагі

Адзіны ў БССР мэханізаваны малакозавод існуе ў Менску. Завод займаецца апрацоўкай салодкага малака, г. зн. ачышчае ад мэханічнага забруджваньня, пастэрызуе, ахалоджвае і пераапрацоўвае яго на кефір, прастаквашу, сырк, стэрылізаваную сметану і зьлўкі.

Усё малако ваколічных бліжэйшых калгасаў і саўгасаў дастаўляецца гужавым транспартам, а з больш далёкіх—па чыгунцы. Праз завод прапускаецца ўсё малако ,якім забясьпечваецца горад.

### Адміністрацыя ня дбае аб якасьці

Не зважаючы на тое ,што завод працуе ў 2 зьмены, прыём малака ад пастаўшчыкоў гужавога транспарту зусім не наладжан: замест здачы а 9 гадзіне даводзіцца чакаць аж да 11 і больш бо... завод не падрыхтоўвае свае ячэйка да пуску машыны. Пастаўшчыкі скардзяцца ,што гэта—рэгулярнае зьяўішча; неарганізаванасьць працы, адсутнасьць дысцыпліны і ўсякай плянавасьці ў рабоце заводу прымушае траціць час і трымаць малако ў флягах пад сонечнаю сьпёкаю па некалькі гадзін.

Часта здараецца, што завод раптам спыняе прыёмку на гадзіну ці больш з прычыны таго, што малако ў апаратах для пастэрызацыі не зьмяшчаецца. Запасной пасуды для малака завод ня мае і зноў гэтым затрымлівае здатчыкаў.

Шмат флягаў прывозіцца пазбіткаваных саломаю, травою, анучамі, газэтнаю паперою ,замест кружкоў-гумак, спэцыяльна прызначаных для ўкупаркі. Пры гаспадарчай пастаноўцы работы завод пакінен на кожную такую флягу выдаваць гумку вылічваючы з дастаўшчыка кошт яе (17 к.). Аднак гэтага ня робіцца з-за нядбайнасьці адміністрацыі, з між тым гумак на складзе Саюзмалака валяецца гібель. У малацэ плавае салома, трава, папера з газэтнаю фарбаю; адміністрацыя заводу лічыць гэта нармальным зьявішчам і наогул ня дбае аб якасьці малака.

### „Мы ня можам абмыць усё на сьвеце“

Так, парожныя флягі павінны вярочацца вымытымі. Для гэтага завод маецца спэцыяльныя машыны. Але-ж гэтага ня робіцца для пастаўшчыкоў малака гужавым транспартам. У выніку—флягі, прастаяўшы па 9-10 гадзін закупаранымі, закісьляюцца і заквашваюць у далейшым малако.

Флягі-ж, прывезеныя чыгуначным транспартам ,не заўсёды дастаткова чыста вымываюцца часта таму, што застаецца мала часу да адпраўкі ня станцыі. Між тым мыечныя машыны заводу недастаткова нагружны работай. Прапускная здольнасьць іх поўнасьцю ня выкарыстоўваецца.

У дзень праверкі брыгадаю на станцыі было знойдзена ня чыста вымытых, з вадою і малаком флягаў для адпраўкі на ст. Беларусь—9 шт., Ратамка—9 шт., Раецішковічы—17 шт., Пухавічы-тэхнічны—12 шт., Талька—6 шт., і г. д. Ад вады флягі іржавеюць. Адміністрацыя-ж заводу кажа на гэта: «мы ня можам абмыць усё на сьвеце.»

Наогул з пастаўшчыкамі адміністрацыя ніколі не пагаворыць, не пацікавіцца, не распытаецца, чаму прывозіцца кваснае, бруднае малако, не параіць не праінспэктуе, як пазбавіцца ад гэтага.

### Прымаюць на смак і на-вока

Малако прымаецца на смакавую спробу, інакш кажучы на вока, а не адпаведнымі прыладамі. Дырэктар заводу тав. Каляда кажа, што яго штат нагэтулькі спэцыялізаваны, што не памыляецца прымаць на вока, але разам з тым ён сам сябе супярэчыць скаргамі на адсутнасьць кваліфікаванай сілы. За ўвесь час прысутнасьці нашай брыгады 30 флягаў было прынята на смакавую спробу, а рэшта—на вока. Аплата за лепшае па якасьці малако—нічым ня розьніцца ад аплаты за горшае.

Усё гэта прымушае сказаць, што адміністрацыя заводу цалкам вінна ў дрэнпай якасьці дастаўленага малака, 25 проц. якога заўсёды скіслае.

### Колькі часу грэецца малако на сонцы

Малако, што прывозіцца чыгункай, забіраюць адтуль уласныя фурманкі заводу... праз гадзін 6 пасьля прыбыцьця поезда. Флягі грузяцца на вазы і пакідаюцца на адкрытым сонцы, пакуль возчыкі яшчэ з гадзіну бегаюць за афармленьнем дакумантаў. Колькі-ж усяго часу грэецца малако на сонцы, пакуль траціць на завод? Што-ж тут дзівіцца ,што яно дастаўляецца кіслым!

Укупарка малака, дастаўленага чыгункаю, такая-ж як і на гужавым транспарце (анучы, салома, сена, трава і і газэта).

### Дзе плянавасьць і вучот?

Завод ня мае ніякага вучоту, колькі і адкуль малака павінна прыбыць, каму і куды трэба разьмеркаваць яго. Гэта ў сваю чаргу не дае магчымасьці наладзіць праверку і рэагаваньне на таго пастаўшчыка, які памяншае свае кантрольныя лічбы ў дастаўцы. Пляну раздачы малака з заводу таксама няма, у выніку чаго бываюць дні, што малака няма куды дзець, а іншы раз дырэктару заводу даводзіцца рабіць «барыкады» ад запатрабаваньняў малака.

Ёсьць шмат недагляду і ў рабоце самога заводу. Так, сыркі вырабляюцца занадта кіслыя, а лябараторыя ня сочыць за гэтым ,вельмі вялікая колькасьць бутэляк для кефіру, разьбіваецца на заводзе,—процант бою дасягае 5; работніцы, якія робяць сыркі працуюць бяз хустак; зусім ня відаць ударніцтва і сацспаборніцтва.

Да таго-ж трэба зазначыць, што прамфінплян заводу за чэрвень выкананы толькі на 75 проц.

Трэба сказаць, што наогул не адчуваецца цьвёрдага кіраўніцтва ўсёй малочнай справай. Досыць сказаць, што ад часу свайго пабудаваньня (1930 г.) завод належыў Менсельпрому, затым быў пераведзены Менакрмалжывёлсаюзу, потым перайшоў да Белмалжывёлсаюзу, ад яго—да Белкапсаюзу, пасьля гэтага,—у МЦРК і нарэшце—да Белкаапмалаб'яднаньня.

### Адзінаначальле не ажыцьцёўлена

І ўсё-ж такі ,калі дырэктар тав. Каляда скардзіцца на бяспрытульнасьць заводу, на тое, што ўся работа ідзе самацёкам ,лык мы пытаем яго:

А чаго-ж ён там сядзіць? Як кіруе заводам? Што зрабіў ён як адзінаначальнік на сваім заводзе, як змагаецца ён за працдысцыпліну, за ўпарадкаваньне работы заводу, за разгортваньне лепшых мэтадаў падвышэньня прадукцыйнасьці працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва?

Якія захады ўжыў ён, каб забясьпечыць ліквідацыю прарываў у прамфінпляне?.

Такое становішча на заводзе, якое існуе на сёньняшні дзень, недапусьцімае. У самы кароткі тэрмін трэба зьнішчыць усе недахопы ў рабоце заводу, павёўшы рашучую барацьбу за ліквідацыю прарываў, ні ў якім разе не спасылаючыся на аб'ектыўныя прычыны.

Неабходна мабілізаваць вакол гэтага пытаньня грамадзкую думку, якая павінна сваім важкім словам выкараніць усе недахопы ў рабоце заводу.

### Мы прапануем

1. Наладзіць прыёмку малака так, каб не затрымліваць здатчыкаў.
2. Заснаваць сталае інструктаваньне пастаўшчыкоў малака.
3. Варочаць толькі добра вымытыя флягі.
4. Забясьпечыць кожную флягу гумовым кружком.
5. Праверку якасьці малака рабіць ад паведнымі прыладамі, а не на-вока. Устанавіць прыём малака і аплату яго па якасьці (жыркасьць і інш.).
6. Паставіць бак-халаддзільнік для зьліваньня малака, калі машыны загружаны работай.
7. Заснаваць спэцыяльную майстэрню па рамонце флягаў ,або дагаварыцца з якой-небудзь рамонтнай арганізацыяй наконт гэтага.
8. Разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва як у рабоце самога заводу так паміжпаміж пастаўшчыкамі малака.
9. Дабіцца 100-процантнай дастаўкі салодкага (не скісьнелага) малака.
10. Наладзіць плянавасьць у рабоце.

Брыгада «Сав. Бел.» Раханскі, Маўшовіч, Апарын, Левітан.

# Дзяржпланам СССР на з рэдакцыямі газэт „Савецкая Беларусь“ і „Калгасьнік Беларусі“ на 19 ліпеня а 7 гадзіне

# СКЛІКАЕЦЦА НАРАДА-КАНФЭРЭНЦЫЯ

## ПА ПЫТАНЬНІ: ШЛЯХІ РАЗЬВІЦЬЦЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БССР У 1932 ГОДЗЕ

Дакладчык—член прэзыдыуму Дзяржпляну—тав. БОНДАР.

Запрашаюцца працаўнікі НДІ сацэканструкцыі, БАН, таварыства аграрнікаў-марксыстаў, Наркамзему, Калгасцэнтру, трэстаў, сел.-гасп. каапэрацыі, друкарні імя Сталіна, заводаў „Энэргія“, „Камунар“, саюзу с-г рабочых; рабселькораў цэнтр. газэт: „Зьвязда“, „Рабочы“, „Чырвоная Зьмена“, „Сельгасрабочы Беларусі“, „Акцябр“, „Орка“.

НАРАДА АДБУДЗЕЦЦА

ў ленінскім кутку Дзяржпляну—Пляц Волі, 5.

# ЦЫРК-КІНО-ТЭАТР

**Мендзяржтэатр**

СЁНЬНЯ гастроль расійскай опэры пад кіраўніцтвам Я. Е. Воўкава

КАРМЭН музыка БІЗЭ

Пачатак а 8 гадзіне

Білеты ў раб. касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.

**Дзяржцырк**

СЁНЬНЯ НОВАЯ ПРАГРАМА

Гастроль эўрапэйскіх артыстаў Саюзу савецкіх артыстаў МАРЧЭС.

Дэбют адзінай у СССР трупы акрабатаў сальтоморталістаў Д. Донвальдзі.

Гастроль—ПЯЦЬ ЭРНАНІ—музычны акт

Першы раз мавіна Захаду—аўтамат-лялька—Фрозо.

Працягваюцца гастролі вэлясыпэдыстаў-фігурыстаў—ПЯЦЬ ПОЛЬДЗІ.

Працяг гастроляў нямецкага атракцыёну 6—РЭДАМ—6

Выезд жокея-наездніка АЛЕКСАНДРА.

Стайня пад кіраўніцтвам А. В. Лапізда

Пачатак гастроляў эквілібрыстаў НАВАРО

Пачатак а 8 гадз. 45 хв. увечары.

Льготныя білеты ў рабкасе

**Дом культуры**

Гастролі 1-га Дзяржаўнага Польскага Тэатру Украіны

17, 18, 19 ліпеня ГУТА Р. КОБЕЦ

У 3-х дзеях пераклад Вандурскага. Пачатак а 8 з пал. г.

Білеты ў рабкасе, а ў дзень спэктаклю ў доме культуры з 5 гадз.

Прымаюцца заяўкі на цэлевыя спэктаклі.

**Кіно „Інтэрнацыянал“**

З 13-га ліпеня замежны фільм

Жонка статс-сакратара

Пачатак а 7 гадзіне

**Кіно „Пралетары“**

З 16 ліпеня ВЯДОМЫ ФІЛЬМ

МАСКА САРВАНА драма ў 7 частках

Пачатак а 2, 3-45, Вяч. а 7, 8-45 і 10-30 г.

**„Чырвоная Зорка“**

ПЕРШЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

ПУЦЁЎКА Ў ЖЫЦЬЦЁ

Драма ў 34 эпізодах

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэктараў—6-15. Выдавецтва—2-44.
падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., на год—12 руб.

Главлітбел № 593

Друкарня імя СТАЛІНА

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ